Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

2 ЧЭРВЕНЯ 2020 г. АЎТОРАК

№ 105 (29219)

ЗВЯЗДА

ЯК ЗМЯНІЛІСЯ ВЫДАТКІ Ў ЧАС ЭПІДЭМІІ 5

ПА БЕЛАРУСІ НА КАНАПЕ 6

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Майданаў у Беларусі не будзе»

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка абмеркаваў са старшынёй Камітэта дзяржаўнай бяспекі Валерыем Вакульчыкам сітуацыю ў краіне

Фота БелТА

Спачатку гаварылі аб тым, што адбываецца вакол палітычнай перадвыбарнай кампаніі.

«Мы ведаем, адкуль вятры дзьмуць на нашу беларускую зямлю. На жаль, не з таго боку, адкуль хацелася б. ***Мы гатовы да любых вятроў***, тым больш у свой час, з гісторыі нашай дзяржавы, савецкай гісторыі вы таксама ведаеце, што на Беларусь вятры дзьмулі з розных бакоў», — пачаў сустрэчу з Валерыем Вакульчыкам Прэзідэнт.

Значным адрозненнем сённяшняга этапу развіцця дзяржаўнасці, на думку кіраўніка дзяржавы, з'яўляецца тое, што краіна навучылася змагацца з гэтымі выклікамі. ***«Тады мы змагацца не ўмелі. Таму не мелі і суверэннай, і незалежнай дзяржавы.*** Заўсёды нас дзялілі на часткі. Далучалі кавалкамі то да адной зямлі, то да другой. Вы ведаеце, што да мінулай вайны мы фактычна былі падзеленыя. Таму сёння гэтага дапусціць нельга. Дзяржаўная бяспека — гэта аснова асноў», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

КДБ і Прэзідэнту належыць вядучая роля па абароне незалежнасці і суверэнітэту дзяржавы, нагадаў ён. Кіраўнік краіны адзначыў, што дасканала ведае мэты тых, хто распаўсюджвае «вецер», — «зладзіць нам майданчык напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў ці ў дзень прэзідэнцкіх выбараў, як атрымаецца ў іх. «Так яны планавалі. ***На гэтай сустрэчы хачу вас папярэдзіць і ўсіх, хто нас пачуе, усіх гэтых «майданутых» хачу папярэдзіць, што майданаў у Беларусі не будзе»***, — лідар краіны быў катэгарычны.

Прэзідэнт выказаў меркаванне, што недарэчна параўноўваць сітуацыю ў Беларусі з былымі падзеямі ў Арменіі, Украіне, і казаць пра з'яўленне ў нашай краіне сваіх Пашыняна (прэм'ер-міністр Арменіі) і Зяленскага (прэзідэнт Украіны). «Я ўжо з імі бліжэй пазнаёміўся, гэта людзі таленавітыя, безумоўна, а галоўнае — патрыёты сваёй краіны. Яны адданыя сваёй краіне, а некаторыя нашы хочуць за капейку прадаць усё, што тут было створана не толькі Прэзідэнтам Лукашэнкам, не толькі Вакульчыкам і ўладай, а было створана народам. Таму гэтага дапусціць нельга, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — ***Мы ніколі не дапусцім дэстабілізацыі абстаноўкі ў нашай краіне.*** Мы нікому не будзем закрываць рот. Калі ласка — вызначаны месцы ў Мінску і ва ўсіх гарадах, дзе можна весці дыскусію». Улады будуць гэтыя месцы кантраляваць, а Камітэт дзяржбяспекі і міліцыя сачыць за захаваннем законнасці. «Мы не павінны дапусціць, каб розная кштальту банды і шайкі крымінальнікаў бадзяліся па краіне з закасанымі рукавамі», — дадаў кіраўнік краіны. Пры гэтым ён адзначыў, што да тых, хто праходзіць гэты перыяд, не парушаючы закон, будуць ставіцца з павагай.

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся бачаннем КДБ эканамічнай, харчовай, ваеннай абстаноўкі і бяспекі ў краіне. СТАР. 2

На буславай сядзібе

Васіль ЗДАНОВІЧ і яго сямігадовая ўнучка Ганна.

Гэты немудрагелісты і ў той жа час радасны бусліны «піруэт» я ўбачыў знянацку, шукаючы абсталяваную крыніцу ў аграгарадку Уселюб Навагрудскага раёна, — за плотам вясковага падворка «гушкаліся» некалькі птушак з бела-чорнымі крыламі. Аказалася, аўтар драўляных сілуэтаў духоўнага сімвала нашай краіны — сам гаспадар, Васіль ЗДАНОВІЧ.

— У мяне на падворку ажно пяць буслоў — трое ў палёце, а два ўжо прызямліліся, — паказвае сваіх пярнатых гасцей Васіль Ціханавіч. — Мая сям'я — жонка, дзеці і ўнукі — падзяляе маю філасофію ўспрымання свету і такога адлюстравання жывой прыроды.

Заняцца арніталагічнай тэмай Васіля Здановіча, можна сказаць, прымусіла любоў да навакольнага асяроддзя. Амаль пятнаццаць гадоў ён у адстаўцы (да таго працаваў у сістэме МУС) і ўвесь вольны час сябруе са сталярным рыштункам: выпілоўвае, высякае, разьбярыць. А яшчэ — вырошчвае кветкі, дагледзе агарод, трымае свойскую жывёлу. Родам ён з Пружаншчыны, нарадзіўся ў вёсцы, у дзяцінстве назіраў за птушкамі.

— Як толькі пачынаецца дружная вясна, я выношу сваіх буслоў з майстэрні, падфарбоўваю і прымацоўваю да расяжкі, — працягвае Васіль Ціханавіч. — А як заканчваецца птушыная «навігацыя», усе маё гадаванцы «адлятаюць» у свой надзейны «вырай».

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

ЦЫТАТА ДНЯ

Алеся САЎКО, кансультант галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі:

«Няма нічога больш каштоўнага для кожнага з бацькоў, чым дабрабыт дзіцяці і яго бяспека. Сям'я для дзіцяці з'яўляецца першым інстытутам сацыялізацыі. Менавіта ў сям'і ён атрымлівае навыкі зносін з навакольным светам, засвойвае правілы паводзінаў і нормы, устаноўленыя ў грамадстве. На жаль, трэба канстатаваць, што кожны год у нашай краіне ад знешніх прычын гінуць дзеці. Не толькі з-за дзіцячай бесклапотнасці, але і з-за безадказных паводзінаў самі бацькоў. Важна захоўваць кантакт са сваім дзіцем, пастаянна камунікаваць з ім, нягледзячы на тое, што ў падлеткавым узросце патрэба ў адасабленні ад бацькоў».

Трыбуна дэпутата

ПРЫЯРЫТЭТЫ: УЗРОВЕНЬ ЖЫЦЦЯ І «САЦЫЯЛКА»

Фота house.gov.by

Некалькі тыдняў таму Прэзідэнт падпісаў указы «Аб матэрыяльным стымуляванні работнікаў арганізацый, якія аказваюць сацыяльныя паслугі» і «Аб сацыяльнай падтрымцы асобных катэгорый грамадзян». Дакументы маюць асаблівую значнасць для пэўных груп насельніцтва краіны — сацыяльных работнікаў, медыкаў, інвалідаў, тых, хто іх даглядае, шматдзетных сем'яў і пар, якія хочуць, але не могуць стаць бацькамі. Па тлумачэнні, чаму гэтыя дакументы асабліва важныя сёння і якія магчымасці даюць насельніцтву, карэспандэнт «Звязды» звярнулася да старшыні Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў Людмілы КАНАНОВІЧ.

— У час пандэміі галоўнымі байцамі, вядома, сталі медыкі. Беларусы імкнуцца падтрымаць тых, хто змагаецца з хваробай. З боку дзяржавы гэта грашовыя надбаўкі паводле Указа № 169 для супрацоўнікаў дзяржаўных устаноў сацыяльнага абслугоўвання і медыкаў. Раскажыце, якая роля парламентарыяў у прыняцці гэтых рашэнняў?

— Асаблівы клопат дэпутатаў — падтрымка найменш абароненых слаёў насельніцтва, сярод якіх пенсіянеры, ветэраны, людзі з абмежаванымі магчымасцямі.

Улічваючы, што кожны з парламентарыяў у сваёй папярэдняй рабоце непасрэдна датыкаўся, прымаў удзел у дзейнасці сацыяльнай службы, мы не маглі ў гэты склад час для нашай краіны і свету ў цэлым, заставацца ўбаку.

Члены нашай камісіі аператыўна наладзілі кантакт з усімі інтэрнатнымі ўстановамі па прыняцце абласнога размяшчэння, каб вывучыць бягучую сітуацыю, своечасова выявіць праблемы. Вынікам работы стала прыняцце сумесных рашэнняў, аказанне падтрымкі і дапамогі не толькі тым, хто пражывае ў гэтых установах, але і супрацоўнікам. СТАР. 2

Канікулы!

НОВЫ КАНТЭНТ ДЛЯ ЛЕТА

Чым заняць дзяцей на 92 дні

У перыяд летніх канікулаў для школьнікаў і студэнтаў падрыхтаваны розныя цікавыя мерапрыемствы, у тым ліку шмат з іх — анлайн. Першага чэрвеня, у Дзень абароны дзяцей, стартаваў сумесны праект-выстаўка з Нацыянальным мастацкім музеем па выніках Міжнароднага конкурсу дзіцячага малюнка «Сябруюць дзеці на планеце». Аб гэтым расказала намеснік дырэктара Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Міністэрства адукацыі Кацярына КУЗЬМЕНКА.

— Будуць прадстаўлены 4,5 тысячы работ з 27 краін свету. З 15 чэрвеня яна будзе даступная на YouTube-канале Нацыянальнага цэнтра, але выстаўку можна будзе наведаць і афлайн. Таксама ў нас ужо праходзіць маштабны трансмедыяпраект «Нясумныя канікулы» для дзіцячых аздараўленчых лагераў «Лета-2020».

На адукацыйнай платформе «Moodle» пачынаюць работу дзевяць арт-анлайн-майстэрняў. Гэта адукацыйны і творчы комплекс займальных заняткаў па розных кірунках мастацкай творчасці: вакал, харэаграфія, дэкаратыўна-прыкладная творчасць, мультыплікацыя, выяўленчае мастацтва. Кожны з курсаў уключае ў сябе тэарэтычныя і практычныя заняткі для дзяцей розных узростаў. Таксама актыўна працуе эксперыментальны анлайн-праект «Лабараторыя творчасці», што складаецца з цыкла разнастайных заняткаў, адукацыйных і творчых анлайн-мерапрыемстваў, якія можна ўбачыць на YouTube-канале Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі. У рамках праекта — пазнавальны канцэрт з рубрыкамі «Музей у цябе дома», дзе прэзентуюцца анлайн-экскурсіі па рэспубліканскіх выстаўках, штотыднёвая рубрыка па чацвяргах «Гульні мастацтва», «Дзеці дзецям» і іншыя. Да таго ж, на працягу ўсяго лета будуць праходзіць іншыя выстаўкі і анлайн-экскурсіі па выставачнай зале цэнтра. СТАР. 3

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У ЗША на фоне беспарадкаў затрымана каля 4000 чалавек

Пра гэта паведамілі тэлеканал CNN. Між тым Associated Press ацэньвае колькасць затрыманых у 4400 чалавек. Пратэсты ахапілі краіну пасля гібелі афраамерыканца Джорджа Флойда ў Мінеапалісе. Беспарадкі закранулі каля 140 амерыканскіх гарадоў. У многіх з іх уведзены рэжым камендантскай гадзіны ці надзвычайнага становішча, больш чым у двух дзясятках штатаў і ў сталіцы — Вашынгтоне да падтрымання парадку прыцягнутая Нацыянальная гвардыя. СМІ па маштабе параўноўваюць хваляванні, якія адбываюцца ў Штатах, з бунтамі пасля забойства Марціна Лютэра Кінга ў 1968 годзе, а таксама пратэстамі супраць вайны ў В'етнаме. Выходным пунктам цяперашняй хвалі пратэстаў стаў Мінеапаліс, затым беспарадкі ахапілі краіну. У прыватнасці, актывісты аблажылі тэрыторыю каля Белага дома ў Вашынгтоне. Пратэстоўцы нават паспрабавалі пералезці цераз агароджу афіцыйнай рэзідэнцыі, і тады ў дзеянне ўключыўся Secret Service — служба аховы прэзідэнта. Па звестках газеты The New York Times, прэзідэнт ЗША Дональд Трамп быў дастаўлены ў спецыяльны бункер, калі дэманстранты імкнуліся патрапіць да Белага дома. Выданне адзначае, што бункер раней выкарыстоўваўся падчас тэрактаў.

Першы прыватны касмічны карабель прыстыкаваўся да МКС

Crew Dragon стаў першым прыватным пілатуемым апаратам, які паляцеў у космас і прыстыкаваўся да Міжнароднай касмічнай станцыі (МКС). Карабель сканструяваны кампаніяй SpaceX Ілана Маска, ён стартаваў 30 мая з касмадрома на мысе Канаверал у Фларыдзе з дапамогай ракеты-носьбіта Falcon 9. Мэтай запуску была дастаўка двух амерыканскіх астранаўтаў — Боба Бенкена і Дага Хёрлі. Пасля запуску Falcon 9 ад ракеты спачатку паспяхова аддзялілася першая ступень, вярнуўшыся на Зямлю, а затым і другая. Адразу пасля гэтага Crew Dragon выйшаў на арбіту. Для ЗША запуск Crew Dragon стаў першым пілатуемым палётам за дзевяць гадоў. Пасля таго як у 2011-м была закрыта праграма Space Shuttle, астранаўтаў NASA на МКС дастаўлялі расійскія караблі «Саюз». Ілан Маск, каментуючы паспяховы запуск, заявіў, што чалавецтва можа ганарыцца новым касмічным караблём Crew Dragon. Паводле яго слоў, гэтая місія стала «першым крокам на шляху да таго, каб людзі сталі мультыпланетным відам».

Астраномы зафіксавалі наймагутнейшую ўспышку на Сонцы

Арбітальная абсерваторыя SDO зафіксавала наймагутнейшую за апошнія тры гады ўспышку на паверхні Сонца. Гэта сведчыць пра завяршэнне анамальна доўгага і спакойнага перыяду сонечнай «спячкі», расказаў ТАСС галоўны навуковы супрацоўнік лабараторыі рэнтгенаўскай астраноміі Сонца Фізічнага інстытута РАН Сяргей Багачоў. «Пры любым варыянце развіцця падзей упэўнена можна сцвярджаць адно: новы сонечны цыкл пачаўся, і ён цалкам вызначыць фізіку нашай зоркі на найбліжэйшыя адзінаццаць гадоў. Сэрца нашага свяцілa па-ранейшаму б'ецца ў рытме, які вызначаны падчас назіранняў на працягу апошніх 400 гадоў», — расказаў навуковец. Астраномам даўно вядома, што на Сонцы перыядычна адбываюцца ўспышкі, падчас якіх свяцілa рэзка вылучае вялікую колькасць энергіі ў выглядзе хваль бачнага святла, цеплавога і рэнтгенаўскага выпраменьвання.

КАРАТКА

- У Мінску ў два разы знізяць арэндную плату за зямлю, падатак на нерухомасць і зямельны падатак.
- **На першым блоку БелАЭС завяршылі вікратокавы кантроль парагенератараў.**
- У школах Беларусі пачынаюцца выпускныя экзамены.
- **Новыя цэны на газ і тарыфы на электраэнергію дзейнічаюць з 1 чэрвеня.**
- Беларусь і Украіна абвясцілі конкурс сумесных навукова-тэхнічных праектаў на 2021—2022 гады.
- **Фізічным асобам з 15 чэрвеня не прыйдзецца выплачваць ПДВ пры ўвозе ў Беларусь электрамабіляў.**

На шляху да Мэт

МЭТЫ УСТОЙЛІВАГА РАЗВІЦЦЯ Ў БЕЛАРУСІ

Час ратаваць... прыродныя выкапні

Стаўленне «выкарыстаў — выкінуў» трэба мяняць на «адсарціраваў — перапрацаваў»

Сучаснаму чалавеку трэба так шмат, што для вытворчасці неабходных рэчаў выкарыстоўваецца не толькі мноства карысных выкапняў, але і ствараюцца матэрыялы, якія не сустракаюцца ў прыродзе. Пры гэтым мы выбраляем не толькі рэчы, а і ўпакоўку для іх. Траціна ўсіх бытавых адходаў на зямлі — гэта тара, для вытворчасці якой неабходны прыродныя рэсурсы. СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем цікавае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

«Майданаў у Беларусі не будзе»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Перыяд ускладняецца тым, што ў нас тут ледзь не чатыры-пяць пандэмій. Адна пандэмія ў сферы аховы здароўя. Дзякаваць богу, што мы патрохі пераадольваем яе. Тут ужо не скажаш, што мы хлусім. Ідзіце ў бальніцы, глядзіце. Накласлася на гэта і палітычная пандэмія ў сувязі з выбарамі, эканамічная пандэмія — крызіс ва ўсім свеце. Не наша віна, бяда наша. І шэраг іншых пандэмій, якія ходзяць каля нашых граніц, але пакуль баяцца сунуць сюды нос. Мы з гэтымі пандэміямі павінны справіцца. Я ўжо не называю інфапандэмію. ***Інфапандэмія — гэта фон для ўсіх пандэмій***. І ў інтэрнэце, гэтай смеціцы, усякае закідваюць. З-за межаў нам, у тым ліку і родныя браты, праблем падкідваюць у сродках масавай інфармацыі. Мы ўсё гэта бачым», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Валерый Вакульчык пачаў свой даклад з таго, што паведаміў: ніякага незвычайнага для спецслужбаў не адбывалася. Камітэт быў падрыхтаваны да развіцця падзей.

«Нічога дзіўнага і нечаканага зараз не адбываецца і не адбылося. Тое, што зараз адбываецца, мы ведалі пра гэта і загадзя дакладвалі вам гэту інфармацыю. Адзінае, могуць быць толькі асобныя моманты, якія мы падкарэктавалі, і ў абсалютна поўным аб'ёме валодаем сітуацыяй», — запэўніў Прэзідэнта старшыня КДБ.

Марыя ДАДАЛКА.

Прыемная навіна

САДОК КОЛЕРУ МАРСКОЙ ХВАЛІ

У Ратамцы адкрылася суперсучасная дашкольная ўстанова

У Дзень абароны дзяцей, 1 чэрвеня, у аграгарадку Ратамка Мінскага раёна адкрыў свае дзверы для маленькіх наведвальнікаў сучасны дзіцячы сад № 2. Пабудавала яго кампанія «А-100».

Падчас урачыстай цырымоніі сімвалічную стужку перарэзалі старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр Турчын, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Мінскай вобласці Ігар Яўсеевіч і старшыня назіральнага Савета групы кампаній «А-100» Аляксандр Цэнтар.

Пасля ўрачыстасцяў загадчыца дашкольнай установы Таццяна Трыгубовіч запрасіла гасцей азнаёміцца з умовамі, у якіх будуць жыць і выхоўвацца малыя. А гэтыя ўмовы сапраўды паспрыяюць духоўнаму, фізічнаму і эстэтычнаму развіццю выхаванцаў.

Ратамскі дзіцячы сад № 2 разлічаны на 230 малых. Займацца яны будуць у дванаццаці групах

www.mfp.by

у залежнасці ад узросту. У тым ліку дзве групы прызначаны для дзяцей ад 2 да 3 гадоў.

У кожнай групы ёсць сваё асобнае памяшканне. Прадугледжаны таксама актавая і музычная залы, кабінеты дэфектолага і псіхолага, рэсурсны цэнтр пол ікультурнага выхавання, пункт карэкцыйна-педагагічнай дапамогі, метадычны кабінет, медыцынскі і харчавальны блокі. У спартыўнай зале ўсталявана спецыяльная сцяна для заняткаў альпінізмам.

Для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця створана бязбар'ернае асяроддзе. Без перашкод перасоўваюцца па будынку ім дапамогуць ліфт, шырокія дзверы, поручні і пандусы. Сістэма відэаназірання дазваляе кантраляваць усю тэрыторыю, якая прылягае да будынка. Яна, дарэчы, агароджана, а ўваход будзе ажыццяўляцца ў трох месцах праз спецыяльныя відэадамафоны.

Садок знаходзіцца ў раёне жылога квартала Пірс, пабудаваным у прыбалтыйскім стылі. Установу вылучаюць незвычайныя фасад і ўнутранае афармленне, яркая выражаная марская стылістыка. Водная тэма прысутнічае і ў інтэр'еры ўстановы. Пакоі для кожнай групы выкананы ў розных колеравых гамах: колеру марской хвалі, насычанага жоўтага сонечнага, светлага блакітнага неба і колеру сіняга мора. На сценах намаляваны хвалі, пузыркі, падводныя героі, пляж, маякі, выратавальныя сродкі. Дзеці змогуць падарожнічаць па моры, вывучаць яго флору і фаўну. А гэта, бясспрэчна, дапаможа развіваць нестандартнае творчае мысленне.

На вуліцы для дзяцей ёсць гульнявыя пляцоўкі з драўлянымі ценявымі навесамі, прарэзіненае бяспечнае пакрыццё, невялікія гаркі, дзе яны змогуць вырошчваць агародніну або зеляніну.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

У цэнтры ўвагі

Дапамога аказваецца

Мінскі гарадскі клінічны анкадыспансер вяртаецца да лячэння профільных пацыентаў. Аб гэтым стала вядома падчас яго наведвання спікерам Савета Рэспублікі Наталляй КАЧАНАВАЙ.

— Кваліфікаваную медыцынскую дапамогу павінны атрымліваць людзі з любымі захворваннямі. Вядома, зараз ва ўсіх на слыху COVID-19, але мы не можам засяроджвацца толькі на адной хваробе. У Мінску тыя аддзяленні, якія былі перапрафіляваны для лячэння хворых на COVID-19, цяпер вяртаюцца да дзейнасці ў нармальным рэжыме, да выканання сваіх функцыянальных абавязкаў. Сёння я тут, каб праверыць, як выконваецца гэта даручэнне Прэзідэнта і наколькі дыспансер гатовы да прыёму пацыентаў, — адзначыла падчас наведвання Наталля Качанава.

У Мінскім гарадскім клінічным анкалагічным дыспансеры для лячэння хворых з каранавіруснай інфекцыяй былі перапрафіляваны два аддзяленні. 4-ы хірургічны корпус дыспансера спыніў сваю дзейнасць як інфекцыйны яшчэ 22 мая — тут ужо апераваюць анкалагічных пацыентаў. Радыялагічны корпус аднавіў сваю дзейнасць з 1 чэрвеня.

— Анкалогія — адно з сур'ёзных захворванняў. Хворыя маюць патрэбу ў дапамозе, і адкладаць яе аказанне нельга, — падкрэсліла старшыня Савета Рэспублікі. — У дыспансер прыязджаюць людзі з розных рэгіёнаў нашай краіны. Перад медыцынскімі работнікамі стаіць вельмі важная задача.

Нагадаем, што калектыў дыспансера пачаў займацца лячэннем пацыентаў, інфіцыраваных COVID-19, з 31 сакавіка. На працягу некалькіх тыдняў тут шпіталізавалі пацыентаў з ліку кантактаў першага ўзроўню. Пасля неабходнага перапынку сюды сталі трапляць пацыенты з пнеўманіямі. Трэба дадаць, што пацыенты анкалагічнага профілю не засталіся без належнай дапамогі: на перыяд дзейнасці дыспансера як інфекцыйнага яны былі перанакіраваныя ў РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя Аляксандрава.

Паводле БелТА.

Ведай нашых!

Здраўніцы Нарачы найлепшыя для адпачынку

Расійскі турыстычны партал ТурСтар склаў рэйтынг курортаў краін СНД для летняга санаторна-курортнага і лячэбна-аздараўленчага адпачынку. У першую тройку ўвайшлі здраўніцы на возеры Нарач (Беларусь), Барабай (Казахстан), Нафталан (Азербайджан). Топ-5 складаюць курорт Джэрмук у Арменіі і возера Ісык-Куль у Кыргызстане.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Грошы

«Малююць» у асноўным долары і расійскія рублі

Серыю падробак упершыню папоўніў новы банкнот наміналам 500 беларускіх рублёў

Нацбанк прааналізаваў падробленыя грашовыя знакі, выяўленыя ў банкаўскай сістэме краіны за мінулы год.

Па выніках сезона было выяўлена 812 фальшывых грашовых знакаў, з якіх 806 — падробленыя банкноты, 6 — падробленыя манеты. Асноўную іх колькасць традыцыйна склалі долары — 45,3 %. Доля падробленых расійскіх рублёў склала 31,8 %, еўра — 17,2 %, беларускіх рублёў — 3,7 %, іншых валют — 2 %.

У прэс-службе фінансавага рэгулятара адзначылі, што ў асноўным грашашэ з грашыма ў нашай сталіцы. Летась у Мінску было выяўлена 44,7 % усіх падробленых грашовых знакаў, у розных абласцях краіны ад 5 % да 11,3 %. Варта заўважыць, што несапраўдныя банкноты былі канфіскаваныя з грашовага абарачэння ў 67 населеных пунктах. У параўнанні з папярэднім годам агульная колькасць выяўленых фальшывак зменшылася на 9,8 %. Колькасць падробленых долараў зрабілася на 22,5 %, расійскіх рублёў — на 4,4 %. А вось фальшывыя еўра паказалі прырост колькасці на 19,7 %. Падробак беларускіх рублёў (узору 2009 і 2000 гадоў) паболела ў абсалютным выражэнні на 13 штук.

Сярод падробленых долараў, як і раней, значна пераважалі купюры наміналам $100 — 88,9 % ад выяўленых, аднак іх колькасць у параўнанні з 2018 годам скарацілася на 25 %. Доля банкнотаў наміналам 50 долараў склала 7,6 %. Усяго выяўлена 327 100-доларавых купюр і 28 — 50-доларавых. Выяўлены адзінкавыя экзэмпляры фальшывых банкнотаў наміналам 20, 10 і 5 долараў.

Сярод выяўленых падробленых долараў 19 купюр належала да катэгорыі частковых падробак: 2 банкноты наміналам 100 долараў, 13 банкнотаў наміналам 50 долараў, 1 банкнот наміналам 20 долараў і 3 банкноты наміналам 10 долараў. Гэтыя фальшывыкі былі выраблены з сапраўдных банкнотаў шляхам змены асноўных літарна-лічбавых малюнкаў на вышэйшыя наміналы.

Летась работнікі банкаўскай сферы сутыкнуліся з якасна падробленымі «баксамі». Да катэгорыі суперпадробак належала 15 банкнотаў розных серый, усе наміналам 100 долараў ЗША. Выяўленыя купюры з'яўляліся раней вядомымі разнавіднасцямі падробак.

Сярод падробленых банкнотаў расійскіх рублёў былі купюры наміналам 5000, 2000, 1000 і 500 рублёў, з якіх асноўная доля паранейшаму прыпадае на 5000 і 1000 рублёў — 77,1 % і 16,3 % адпаведна. Банкноты наміналам 2000 і 500 рублёў складалі 6,2 % і 0,4 % адпаведна. У параўнанні з 2018 годам летась больш чым у два разы (у абсалютным выражэнні на 10 штук) вырасла колькасць падробак банкнот наміналам 2000 рублёў і зменшылася на 37,3 % — наміналам 1000 рублёў. Колькасць выяўленых купюр наміналам 5000 рублёў зменшылася на 1,5 %. Як і ў 2018 годзе выяўлены 1 банкнот наміналам 500 рублёў. Падробленыя еўра выяўляліся ўсіх наміналаў, акрамя 10 еўра. Найбольшая колькасць па-ранейшаму прыпала на намінал 50 еўра — 36,4 % ад выяўленых экзэмпляраў. У параўнанні з 2018 годам больш чым у два разы (у абсалютным выражэнні на 21 штуку) вырасла колькасць падробак наміналам 500 еўра, якая склала 26,4 % ад выяўленых. Колькасць купюр наміналам 100 і 200 еўра выраслa ў абсалютным выражэнні на 7 і 1 штуку, скаўшы долю ў 19,3 % і 5 % адпаведна. Колькасць выяўленых банкнотаў наміналам 20 еўра зменшылася ў абсалютным выражэнні на 6 штук, а наміналам 5 еўра склала 2 штукі. Усе 6 падробленых манет мелі намінал 2 еўра.

Сярод выяўленых падробак еўра варта адзначыць банкнот наміналам 200 еўра, які ўяўляе сабой частковую падробку. Ён выраблены з сапраўднага банкнота наміналам 200 сербскіх дынараў, на якім выдалены асобныя малюнкі з наступным нанясенне новых на прынтарах.

Падробленыя беларускія рублі ўзору 2009 года ў 2019 годзе паказалі значны прырост у параўнанні з 2018 годам — у абсалютным выражэнні на 18 штук. Асноўную іх долю склалі банкноты наміналам 50 і 20 рублёў — 9 і 12 штук адпаведна. Банкноты наміналам 10 і 5 рублёў выяўленыя ў кольказі 5 і 2 штук. Сукупнасць наміналаў падробленых банкнотаў узору 2009 года ўпершыню папоўніла купюра наміналам 500 рублёў. У адной з падробак наміналам 20 рублёў праведзена імітацыя вадзянога знака белага колеру. Астатнія выяўленыя фальшывыя беларускія рублі былі выраблены без імітацыі элементаў абароны.

Колькасць падробак беларускіх рублёў узору 2000 года ў параўнанні з 2018 годам зменшылася ў абсалютным выражэнні на 5 штук. Яны прадстаўлены адным банкнотам наміналам 100 000 рублёў.

Ацэнка спосабаў капіравання малюнкаў падробленых банкнотаў сведчыць, што з выкарыстаннем паліграфічных тэхналогій выраблена 78 % долараў (у асноўным тэта афсетны, а таксама глыбокі друк), 77 % еўра, 7 банкнотаў кітайскіх юаняў, 2 — фунтаў стэрлінгаў, 1 банкнот наміналам 5000 расійскіх рублёў (афсетны друк). Для рэпрадукцыі малюнкаў астатніх падробленых долараў, еўра, кітайскіх юаняў, фунтаў стэрлінгаў, усіх расійскіх рублёў (за выключэннем аднаго банкнота), украінскіх грыўняў і беларускіх рублёў была выкарыстана тэхналогія рэпрографіі — прынтары.

Сяргей КУРКАЧ.

ОАО «НАФТАН»

РЕАЛИЗУЕТ НА КОНКУРСНОЙ ОСНОВЕ (С ПОВЫШЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ) БЫВШЕЕ В УПОТРЕБЛЕНИИ НЕИСПОЛЬЗУЕМОЕ ИМУЩЕСТВО

Пометка на конверте	Наименование	Инв. №	Год ввода в эксплуатацию	Начальная цена без НДС, руб. РБ	Начальная цена с НДС, руб. РБ
Реализация неликвидов, Полимир, 02.07.2020	Резательная машина	195111	2004	645,83	775,00
	Резательная машина	195112	2004	645,83	775,00
	Резательная машина МРБ-100	195349	2005	2 605,00	3 126,00
	Преобразователь частоты VLT-2855	202470	2004	85,00	102,00
	Танк-контейнер двадцатифутовый наливной – 11 штук	166885	1987	5 500,00	6 600,00
		166906	1987	5 500,00	6 600,00
		166913	1987	5 500,00	6 600,00
		166919	1987	5 500,00	6 600,00
		166921	1987	5 500,00	6 600,00
		166924	1987	5 500,00	6 600,00
		166936	1987	5 500,00	6 600,00
		166938	1987	5 500,00	6 600,00
		166943	1987	5 500,00	6 600,00
		166947	1987	5 500,00	6 600,00
		166948	1987	5 500,00	6 600,00
	Танк-контейнер – 7 штук	169144	2001	5 500,00	6 600,00
		169145	2001	5 500,00	6 600,00
		169147	2001	5 500,00	6 600,00
		169150	2001	5 500,00	6 600,00
		169151	2001	5 500,00	6 600,00
		169153	2001	5 500,00	6 600,00
		169154	2001	5 500,00	6 600,00
Реализация неликвидов, Нафтан, 02.07.2020	Борона для гравия	06270543	2007	22,00	26,40
	Борона для гравия	06270544	2007	22,00	26,40
	Снегоочиститель тракторный	06280445	2013	110,00	132,00
	Пневмоконструкция «Горка 5,5*3*5 м»	16316596	2013	235,00	282,00
	Пневмоконструкция «Батут круглый 4,5х3,7, с подушкой 1,2х3,7»	16316598	2013	152,50	183,00
	Станок 2012	06000142	1996	160,00	192,00
	Агрегат сварочный дизельный АДД-4004	06274841	2010	4 416,00	5 299,20

Состояние удовлетворительное.

Предложения принимаются по адресу: 211441, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101, до 9.30 по местному времени 2 июля 2020 года с пометками на конверте, указанными в таблице, либо в электронной форме на e-mail: tender.box@naftan.by с вышеуказанными пометками.

Извещения на проведение конкурсов размещены на сайте www.naftan.by.

Контактные телефоны: 8 (0214) 59-87-83, 8 (0214) 59-89-26, 8 (0214) 59-88-42, 8 (0214) 59-88-01.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

ЛОТ 2: автобус-вагон МАЗ 256270, 2008 г. в., гос. № АА 6615-4, vin Y3M256270B0001056.
Начальная цена продажи лота – 12 000 руб. (двенадцать тысяч рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 1 200 руб. (одна тысяча двести рублей)

ЛОТ 3: грузовой автомобиль – платформа тентовая МАЗ 437130 332, 2009 г. в., гос. № АВ 2549-4, vin Y3M437130900000217.
Начальная цена продажи лота – 9 300 руб. (девять тысяч триста рубле) с учетом НДС. Сумма задатка – 930 руб. (девятьсот тридцать рублей)

ЛОТ 5: автомобиль – грузовой фургон изотермический GAZ – 33106 «Белава-420», 2012 г. в., гос. № АЕ 5429-4, vin 331040C0025325, X96331060C1023208.
Начальная цена продажи лота – 12 838,16 руб. (двенадцать тысяч восемьсот тридцать восемь рублей шестнадцать копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 1 283 руб. (одна тысяча двести восемьдесят три рубля)

ЛОТ 7: грузовой специальный подъемник гидравлический ZIL-431412, 1990 г. в., гос. № АА 0539-4, vin L2990381, подъемник ВС 22-01.
Начальная цена продажи лота 7 020 руб. (семь тысяч двадцать рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 702 руб. (семьсот два рубля)

Продавец –
Открытое акционерное общество «Лакокраска», г. Лида, 231300, г. Лида, ул. Игнатова, 71, тел.: 8-0154-53-84-30, факс 8-0154-53-85-92

Организатор торгов –
Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 8-0152-55-87-70

Условия проведения аукциона:
- возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи объекта.

Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов. Условия оплаты – по договоренности сторон

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 15 июня 2020 г. в 14.00
по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 27.02.2020 г.

Заявления на участие принимаются по адресу:
г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208,
с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).
Обед с 12.30 до 13.18

Последний день приема заявлений – 11 июня 2020 г. до 15.00

Телефон для справок: 55-87-71 –
Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
http://grino.by/

Прырытэты: узровень жыцця і «сацыялка»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Працуючы непасрэдна ў акругах, мы адзначалі, што работнікі сацыяльнай абароны сёння на роўных з медыкамі знаходзяцца на перадавой. Узраслі напружанасць працы, адказнасць за здароўе сваіх падапечных і ўласнае, з'явіліся рызыкі заражэння, змяніўся рэжым — супрацоўнікі перайшлі на дзяжурства вахтавым метадам у рэжыме поўнай ізаляцыі. Мы разумелі і агучвалі, што ў такой сітуацыі неабходныя меры па дадатковым стымуляванні працы тэрыторыі работнікаў.

Аператыўнасць распрацоўкі Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны механізму матэрыяльнага стымулявання заслугоўвае слоў падзякі, а прапанаваныя меры і парадак іх рэалізацыі знайшлі падтрымку. Дзяржава, Мінпрацы робяць шмат для стварэння бяспечных, камфортных умоў пражывання ў гэтых установах. Калі мы разам, мы можам зрабіць больш!

— На якую падтрымку могуць разлічваць сацыяльныя работнікі згодна з указам?

— Указам вызначаны надбаўкі супрацоўнікам у залежнасці ад пасады і выяўлення ў гэтых арганізацыях інфекцыі па пераліку, які вызначаецца Міністэрствам аховы здароўя. Згадаем надбаўку ўстанаўліваецца дыферэнцыравана ў залежнасці ад катэгорыі работнікаў і ступені іх кантакту з інфіцыраванымі.

Вельмі важна, што работнікам сацыяльнага абслугоўвання пры пераходзе на вахтавы метад выдзяляюцца памяшканні для пражывання ў арганізацыях і выплачваецца кампенсацыя ў адпаведнасці з заканадаўствам.

— Вядома, што цяпер дзяпутаты аказваюць падтрымку сацыяльным установам не толькі заканадаўчымі ініцыятывамі, але і сродкамі. Ваша пастаянная камісія таксама далучылася да гэтай справы?

— Безумоўна, сёння парламентарыі актыўна далучыліся да дабрачыннага марафону па аказанні дапамогі і падтрымкі ўсім установам сацыяльнай абароны. Збор асабістых грашовых сродкаў для прадухілення распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі ажыццяўляецца пастаянным камісіямі, першасным арганізацыямі грамадскіх аб'яднанняў, створанымі ў Палаце прадстаўнікоў.

Разам з падтрымкай арганізацый аховы здароўя аказваем пасільную матэрыяльную дапамогу ўстановам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. У прыватнасці, Пастаяннай камісіяй па працы і сацыяльных пытаннях за асабістыя сродкі закуплена малочная прадукцыя для спецыялістаў дзяржаўнай установы «Псіханевралагічны дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў № 3 горада Мінска», якія працуюць у рэжыме поўнай ізаляцыі.

«Да мяне неаднаразова на прыёме грамадзян і падчас сустрэч у працоўных калектывах звярталіся маці, якія нарадзілі чатырох дзяцей, маці, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, — яны не маглі сфарміраваць нават пяць гадоў стажу працы з выплатай узносаў у ФСАН».

Дэпутатамі ад Брэсцкай вобласці закуплены за свой кошт 100 аднаразовых ахоўных касцюмаў, 100 пар высокіх бахілаў і 50 ахоўных шчыткоў, якія перададзены Кобрынскаму псіханевралагічнаму дому-інтэрнату для састарэлых і інвалідаў.

— Яшчэ адзін сацыяльна значны дакумент, падпісаны Прэзідэнтам на мінулым тыдні, — Указ № 171 «Аб сацыяльнай падтрымцы асобных катэгорый грамадзян». Раскажыце пра яго асноўныя новаўвядзенні.

— З 1 студзеня 2021 года для жанчын, якія нарадзілі чацвярых дзяцей, да 12 гадоў вырасце працягласць знаходжання ў водпуску па доглядзе дзіцяці, якая залічваецца ў працоўны стаж для прызначэння пенсіі. Цяпер такі прамежак складае 9 гадоў. Гэтыя маці змогуць прэтэндаваць на прызначэнне працоўнай пенсіі пры наяўнасці стажу працы не менш за 20 гадоў і страхаванога стажу не менш за 10 гадоў (цяпер — 17,5 года).

З наступнага года для інвалідаў I і II груп, дыягназ у якіх пастаўлены больш за 10 гадоў таму, знімаецца патрабаванне да страхавога стажу для прызначэння пенсіі па ўзросце прапарцыянальна часу знаходжання на інваліднасці.

Для інвалідаў з дзяцінства на 5 гадоў знізяць патрабаванні да працягласці працоўнага стажу для атрымання права на датэрміновую пенсію па ўзросце (для жанчын — з 20 гадоў да 15 гадоў, для мужчын — з 25 гадоў да 20 гадоў).

Прадугледжаны шэраг дадатковых гарантый і для сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў. Бацькі дзяцей-інвалідаў з цяжкай ступенню страты здароўя, якія доўгі час ажыццяўлялі догляд за імі (як мінімум 20 гадоў), змогуць атрымліваць павышаную сацыяльную пенсію. Яна будзе супастаўная з мінімальнай пенсіяй па ўзросце.

Пашыраны магчымасці атрымання пенсіі з прычыны страты кармільца. Яе зараз змогуць прызначаць асобам, якім на месцы працы далі водпуск па доглядзе за дзіцем да трох гадоў. Пры гэтым такія грамадзяне не павінны з'яўляцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, натарыусамі, адвакатамі, рамеснікамі.

Яшчэ адна катэгорыя сем'яў, якая не застанецца па-за ўвагай, — пары, якія не могуць мець дзяцей. Указ дае магчымасць правесці адну бясплатную спробу ЭКА за кошт дзяржавы. Гэта, безумоўна, паўплывае на паляпшэнне дэмаграфічнай сітуацыі ў краіне. На жаль, сёння прыкладна кожная шостая пара ў Беларусі пакутуе ад бясплоднасці. Метад ЭКА працуе ўжо даўно, але гэта вельмі дарагая працэдура.

У Беларусі было прынята рашэнне аб выдзяленні льготных крэдытаў на гэтыя мэты. І вось зараз дасца магчымасць праводзення працэдуры за кошт бюджэту, бо якая радасць і гонар мець поўную сям'ю.

— Чаму гэтых навацый так чакалі грамадзяне?

— Дакумент чарговы раз падкрэслiў, што наша дзяржава сацыяльна арыентаваная і на працягу многіх гадоў праводзіць узважаную, разумную сацыяльную палітыку. У рамках кампетэнцый Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях прыярытэтнай застаецца работа па павышэнні ўзроўню жыцця насельніцтва і якасці сацыяльных паслуг.

Да прыняцця дакумента была праведзена вялікая сумесная работа Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны, парламентарыямі, мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, грамадскасцю, выбаршчыкамі. Да мяне неаднаразова на прыёме грамадзян і падчас сустрэч у працоўных калектывах звярталіся маці, якія нарадзілі чатырох дзяцей, маці, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, — яны не маглі сфарміраваць нават пяць гадоў стажу працы з выплатай узносаў у ФСАН, маладыя сем'і, якія з шэрагу аб'ектыўных прычын не маглі доўгі час мець дзяцей. Разам мы выпрацоўвалі дзеянні і прапановы па вырашэнні іх праблем і паляпшэнні сітуацыі ў цэлым.

Марыя ДАДАЛКА.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Лот 1: капитальное строение, инв. № 412/С-24197 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – заготовительный парек), площадью 49,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Мосты, ул. Кирова, 37А.
Лот № 2 расположен на земельном участке, кадастровый номер 424050100006000382 (назначение – для обслуживания здания заготовительного парька), площадью 0,0221 га, расположенном по адресу: г. Мосты, ул. Кирова, 37/2.

Начальная цена продажи – 3 000 руб. (три тысячи рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 300 руб. (триста рублей)

Продавец – Гроднооблпотребобщество (Мостовский филиал), 231600, г. Мосты, ул. 30 лет ВЛКСМ, 1, тел./факс 8-01515-325-22

Организатор торгов –
Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 55-87-70, 55-87-70

Условия проведения аукциона – возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи объекта.
Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 06 июля 2020 г. в 11.00
по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 10.03.2020 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:
г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209,
с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)

Последний день приема заявлений – 01 июля 2020 г. до 15.00

Телефон для справок: 55-87-71 –
Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
https://grino.by/aukcion/

Утерянные страховые полисы по добровольному страхованию от несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии ЕМ № 0870253 – 0870255, 1016987 – 1017020, 1051510, 1322580, 1322588, 1323206 – 1323209, 1323287 – 1323290, 1335557 – 1335562; страховой сертификат, удостоверяющий заключение договора страхования «Зеленая карта» серии BY/12/№ 17081629 филиала СООО «Белкоопстрах» в г. Минске № 2 **считать недействительными.** УНП 100708519

Час ратаваць... прыродныя выкапні

Тара з дрэў, пяску і нафты

Мяркуйце самі. Папяровая тара робіцца з дрэў, якія становяцца пачкамі для сокаў, торбамі для крам і пакетамі для чабурэкаў.

Каб стварыць металічную ўпакоўку і фольгу для кансерваванай ежы, дзэадарантаў ці газіроўкі патрэбны сталь і алюміній. Іх здабываюць з руды на металургічных заводах, якія ствараюць яшчэ больш адходаў і забруджваюць паветра.

Нават для выторчасці шклянак і бутэлек, якія могуць служыць паўторна, трэба мноства пяску і энергіі для яго плаўлення. А каб стварыць неабходную тэмпературу ў 1500 °C, выкарыстоўваюць прыродны газ.

Выраб таннага, але вельмі небяспечнага для прыроды штучнага матэрыялу — пластыкавай упакоўкі — таксама не абыходзіцца без карысных выкапняў: газу і нафты.

— Цягам мінулага стагоддзя карысных выкапняў здабылі больш, чым за ўсю папярэднюю гісторыю чалавецтва. Іх вычарпальныя запасы ўрэшце скончацца, і чалавецтва вернецца назад у каменны век, калі не зменіць спосаб выкарыстання рэсурсаў, — упэўнена **Ніна КУЛЬБЕДА-КАМШЫЛАВА, галоўны спецыяліст па інфармацыйнай рабоце дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў».** *— Для гэтага трэба перапрацоўваць адходы, выкарыстоўваючы іх паўторна для вытворчасці замест прыродных выкапняў. Макулатура замест дрэў, шклянкі і бутэлькі замест пяску, металалом замест руды, пластык замест нафты і газу. Так мы зможам не толькі паменшыць аб'ёмы выкарыстання карысных выкапняў, але і знізіць негатыўнае ўздзеянне на наваколле ад работы прадпрыемстваў па вырабе разнастайных рэчаў для чалавецтва, у тым ліку ўпакоўкі.*

Чаго прырода не прымае

Разам з тым упакоўка робіць нашa жыццё больш зручным. Прынамсі, яна абараняе прадукты ад дэфармацыі падчас транспарціроўкі і дазваляе ім захоўвацца даўжэй і не псавацца. Аднак сучаснае жыццё адсоўвае гэтыя карысныя ўласцівасці на другі план. Усё больш акцэнт робіцца на ўздзеянне на спажыўца, каб матываваць яго захапіцца прыгожымі яркімі этыкеткамі і прымусіць набыць тавар, які часта яму непатрэбны, але здаецца прывабным і таму неабходным.

— Часта ў гонцы за пакупніком памеры тары значна перавышаюць патрабуемыя для тавару. З-за ўпакоўкі такім чынам колькасць смецця павялічваецца ў сотні разоў, — удакладніла Ніна Кульбеда-Камшылава.

Рост якасці і зручнасці жыцця ўвёў ва ўжытак сінтэтычныя рэчы, аднаразовыя рэчы, упакоўку. З'явілася новая мадэль паводзінаў: «выкарыстаў — выкінуў».

— Склад смецця ў параўнанні з папярэднімі пакаленнямі рэзка змяніўся. Упакоўка, адзенне, рэчы з сінтэтыкі, прадметы невысокай якасці, якія выкарыстоўваюцца аднамоментна, «электроннае» смецце з бытавых прыбораў. Усё гэта немагчыма перапрацаваць у новую сыравіну, — расказала прадстаўніца Аператара ДМР. *— У Беларусі ўжо 160 палігонаў. Смецця ствараецца столькі, што за два гады звалкі вырастаюць на 15 метраў у вышыню, і змлі пад іх займаецца ўсё больш. Толькі за апошнія 15 гадоў вывез смецця на звалкі ўзрос удвая.*

Гамак з джынсаў і сажалка з ванны

Пахаванне адходаў — самы просты і танны спосаб пазбавіцца ад іх, аднак ён шкодзіць наваколлю і здароўю чалавека. Смецце выдзяляе таксічныя арганічныя злучэнні і цяжкія металы, якія могуць трапіць у глебу і грунтавыя воды. А звалачны газ, які ствараецца з-за гніення адходаў, — сумесь метану і дыяксіду вугляроду — уздымаецца ў паветра і паскарае стварэнне парніковага эфекту. Эфект ад метану ў 25 разоў мацнейшы, чым ад вугляксілага газу, падзялілася спецыяліст:

— Калі ж на палігоне здараецца пажар, у паветра ўздымаюцца ўсе таксіны, якія ёсць у сучасным бытавым смецці, накшталт асабліва ўстойлівых злучэнняў фуранаў і дыяксінаў.

Каб планета не патанула ў смецці, трэба вытрымліваць тры правілы. Прадухіляць стварэнне вялізнай колькасці адходаў, паўторна іх выкарыстоўваць і перапрацоўваць смецце. Раздзельна сабраныя і правільна ўтылізаваныя адходы паперы, шкла, пластыку могуць стаць новымі карысныміі рэчамі. Да таго ж, перапрацоўка дазваляе эканоміць прыродныя выкапні пры вырабе новых рэчаў і памяншаць рост звалак.

Каб менш смеціць, трэба змяніць свае звычкі, ставячыся да набыцця рэчаў рацыянальна, а не бяздумна, скупляючы ўсё, што прыгожа ляжыць і выглядае.

— Адмоўцеся ад аднаразовых рэчаў. Непатрэбнае вам аддавайце тым, каму гэта абавязкова спатрэбіцца — у краіне шмат дабрачынных арганізацый. Адрамантуйце зламаную тэхніку, перш чым выкідваць яе і набываць новую. Знайдзіце новае прымяненне старым рэчам. Са старых джынсаў можна змайстраваць цудоўны гамак, а непатрэбная ванна ператворыцца ў штучную сажалку на ўчастку. А вазоны для кветак можна ствараць увогуле з чаго заўгодна, — раіць Ніна Кульбеда-Камшылава. *— У інтэрнэце цяпер можна знайсці працэсу падказак і прапаноў, як самастойна зрабіць прыгажосць з таго, што вы збіраецеся выкінуць.*

Найлепшыя адходы — тыя, якіх няма!

Такога прынцыпу прытрымліваецца Аператар ДМР. Каб дапамагчы людзям навучыцца адказнаму спажыванню і папулярызаваць раздзельны збор адходаў на Youtube пад тэгам *#лучшиеотходы99* размясцілі цэлую серыю роліка? пра рацыянальнае прыродакарыстанне і абыходжанне з адходамі: https://www.youtube.com/playlist?list=PLTiv3qYLSutDsplsuWV04t1ngSNNLtWBTw.

— Па ацэнках навукоўцаў, прыкладна 40 % пластыкавых вырабаў маюць тэрмін службы менш за месяц. Пластыкавы пакет мы ўвогуле выкарыстоўваем каля гадзіны, пасля чаго часта выкідваем. Такім чынам атрымліваецца, што мы проста набываем смецце, — мяркуе **Наталля БУРАЯ, вядучы спецыяліст па інфармацыйнай рабоце дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў».** *— З-за бясплатнай і неабмежаванай прапановы беларусы ўжываюць за год да чатырох мільярдаў фасовачных пакетаў і 200 мільёнаў адзінак пластыкавага посуду. Прырода стварала карысныя выкапні мільёны гадоў, а чалавек ужывае ўпакоўку, выкарыстоўваную каля гадзіны, пасля чаго выкідвае.*

Навучыцца захоўваць камфортны лад жыцця і пры гэтым выпрацяўваць смеццевае становішча на планеце і закліканы асветніцкія ролікі рубрыкі «Мэта-99». Экспэрты спадзяюцца, што атрымаюцца і відзеа ведзены беларусы ператворацъ у штодзённыя звычкі і прынясуць карысць прыродзе і грамадству.

Ірына СІДАРОК.

Надвор'е

Пасля Ізольды прыйдзе пацяпленне

Да канца першага тыдня чэрвеня будзе да 25 цяпла

Вось ужо высакосны год багаты на сюрпрызы. Не было маразоў зімой, дык і не стала цяпла вясной. Май наогул запомніўся як вельмі халодны месяц. Сярэднямесячная тэмпература паветра па краіне ў апошнія 30 дзён вясны аказалася на 2-3 градусы ніжэйшая за кліматычную норму. Так халодна ў маі апошні раз было ў 1999 годзе. На працягу месяца Беларусь адчувала дэфіцыт ападкаў, але ў апошнія дні мая паўднёвы цыклон Ізольда шчодра іх раздаў. У выніку на большай частцы тэрыторыі краіны выпала каля кліматычнай нормы, а на ўсходзе Магілёўскай і Гомельскай абласцей — больш за дзве месячныя нормы ападкаў, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Сёння ўдзень надвор'е таксама будзе мала падобнае на летняе, хутчэй, на восеньскае, адзначаюць сіноптыкі. У асноўным па краіне будзе воблачна і дажджліва. У сераду і чацвер наша краіна будзе знаходзіцца пад уплывам атмасферных франтоў і ў халодная паветранай масе. Таму ў сераду будзе воблачна з прасненнямі. У многіх раёнах час ад часу пройдуць дажджы. Удзень месцамі магчымыя навальніцы. Вецер прагназуецца ўсходні ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 4 да плюс 9 градусаў, удзень — 11—18 цяпла.

Мала сонца будзе і ў чацвер. У гэты дзень будзе воблачна з прасненнямі. Уначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах магчымыя навальніцы. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 4 да плюс 10 градусаў. Удзень будзе 13—18 цяпла, месцамі — да плюс 20 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчыннага сіноптыкаў, у канцы тыдня пры паўднёвым, паўднёва-ўсходнім ветры ў разрывах хмар усё часцей пачне выглядаць сонца. Тэмпература стане павышацца. Да выхадных у сярэдзіне дня ў многіх раёнах чакаецца плюс 20 градусаў, месцамі пры працяглых прасненнях паветра будзе падагравацца да 22—25 цяпла. Месцамі чакаюцца кароткія цёплыя дажджы.

Сяргей КУРКАЧ.

• Дарэчы

«Пластыкавая рыбалка» на Лімanадній планеце

Другая серыя мультсерыяла «Каманда 99», які расказвае дзецям і іх бацькам аб правільнай сарціроўцы адходаў, выйшла ўчора на Youtube-канале Target99 Belarus: **https://youtu.be/jhk9gOoAWeM.** У першай серыі яноты-сарціроўшчыкі перамаглі Папяровага монстра на Зялёнай планеце. Гэтым разам Ківі, Лімон і Ажына адпраўляюцца на «Дзіўную рыбалку», каб дапамагчы ачысціць возера, якое забрудзілася з-за таго, што жыхары Лімanадній планеты заколвалі пластык у зямлю.

Мультсерыял створаны айчыннымі аніматарамі на заказ дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» у межах праекта «Рух «Мэта 99». У ім расказваецца, як важна берагчы прыродныя рэсурсы і клапаціцца пра наваколле, і тлумачыцца, што ў гэтым дапамагае раздзельны збор смецця і перапрацоўка адходаў.

Кожны рабочы дзень маленькіх супергерояў — заданне міжпланетнага маштабу, а па мужнасці і вынаходлівасці Лімон, Ківі і Ажына не саступаюць ратавальнікам і дэтэктывам. Падчас сваіх прыгод яны робяць свет больш чыстым і вучаць гэтаму ўсіх.

— Разуменне правільнага абыходжання з адходамі і непатрэбнымі рэчамі павінна ўкараніцца ў мысленні дзяцей на ўзроўні звычак асабістай гігіены. Яны павінны ведаць, што сарціроўка адходаў эканоміць прыродныя багацці і прадухіляе стварэнне новых палігонаў, а правільная ўтылізацыя не шкодзіць навакольнаму і здароўю чалавека, — упэўнена **Ніна КУЛЬБЕДА-КАМШЫЛАВА, галоўны спецыяліст па інфармацыйнай рабоце дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў».** *— Праз вясёлыя прыгоды яноты дзеці зразумеюць, што збіраць адходы асобна — па сілах кожнаму, і любы можа стаць супергероем.*

Дзеці даведаюцца, што правільна збіраць пластык — не толькі карысна, але і весела, калі яго плюшчыць, каб больш увайшло ў сметніцу. А дарослыя зразумеюць, як самы паспяховы стартап па вытворчасці лімanаду можа стацца экалагічнай катастрофай.

На слыху

90 МІЛЬЁНАЎ ЕЎРА — АД СУСВЕТНАГА БАНКА

Міністэрства аховы здароўя падпісала пагадненне аб пазыцы з Сусветным банкам. Ён выдаткаваў нашай краіне 90 мільёнаў еўра. Грошы пойдуць на закупку сродкаў аховы, аснашчэнне для рэанімацый, а таксама інфармаванне насельніцтва. Упершыню ў гісторыі Міністэрства аховы здароўя падпісанне дакументаў адбылося анлайн.

Чаму наогул чытачы аддаюць перавагу нелегальна спампаваным праз інтэрнэт, а не набытым у кнігарні выданням? Спецыялісты кнігавыдавецкай сферы гавораць, што з-за вялікага падатку на дабаўленую вартасць у Беларусі дарагая паліграфія, а таму выніковы кошт кнігі для пакупнікоў занадта высокі. **Андрэй Янушкевіч,** кіраўнік прыватнага выдавецтва «Янушкевіч», прыводзіць красамоўныя лічбы: прэміум-падпіска, гэта значыць, неабмежаваны доступ да ўсіх выкладзеных кніг, у некаторых анлайн-бібліятэках абыдзецца чытачу ў 20 рублёў на месяц — колькі сучасных папяровых кніг можна набыць на гэтую суму? Таму пытанне ПДВ — адно з самых балючых для выдавецкай сферы, і падчас сустрэчы на разі гучалі прапановы зрабіць стаўку падатку нулявой, як ужо было ў 2000-м — прынамсі, для беларускамоўных кніг, каб стымуляваць іх выданне і попыт.

Але эканоміка тут вырашае далёка не ўсё. Сярод іншых праблем, на якія звярнулі ўвагу прафесіяналы кніжнай галіны і прадстаўнікі Мінінфарма, — абарона і развіццё ўнутранага літаратурнага рынку, інфармацыйная падтрымка і прасоўванне, у тым ліку праз папулярныя сацыяльныя сеткі, новых аўтараў, якія стваральнасць нацыянальны кантэнт, а таксама перагляд састаўрэлых нарматыўных актаў, якія абмяжоўваюць выдавецкую дзейнасць (некаторыя з іх, напрыклад, датуюцца сярэдзінай мінулага стагоддзя і напрыклад, ужо не адпавядаюць рэаліі). «Мы гатовыя хоць сёння выпускаць у беспаперовым, электронным варыянце цэлы шэраг навуковай і вучэбнай літаратуры, — гаворыць кіраўнік выдавецтва «Вышэйшая школа» **Аляксандр Нячай,** — але законам не прадугледжана, як у такім выпадку сфарміраваць кошт, як разлічыць аўтарскі ганарар, не рэгламентаванай іншыя важныя рэчы. Тут цэлае некранутае поле для работы заканатворцаў!»

Удзельнікі круглага стала прыйшлі да высновы, што, каб пераадолець наступствы крызісу, справакаванага пандэміяй каранавіруса ў свеце, прасоўваць кнігі павінны ўсе, хто задзейнічаны ў працэсе іх выпуску і распаўсюджвання: самі аўтары, выдаўцы, кнігарні, шукаючы новыя фарматы ўзаемадзеяння з пакупнікамі. «Трэба прадумаць, як абагульніць і арганізаваць гэту сумесную работу, а да вас, паўтарыся, мы чакаем канкрэтных прапаноў і ініцыятыў, якія могуць быць рэалізаваныя ў падтрымку нацыянальнага кнігавыдання», — рэзюмаваў Ігар Бузоўскі і адзначыў, што падобныя сустрэчы і распрацоўка агульнай стратэгіі будуць працягвацца.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

Наш кашалёк

У РЭЖЫМЕ БОЛЬШАЙ ЭКАНОМІІ

Як змяніліся выдаткі ў перыяд эпідэміі

Яшчэ ў канцы мінулага года мы нават не ўяўлялі сабе, наколькі моцна зменіцца наша жыццё ў 2020-м. Медыкі ў ахоўнай экіпіроўцы, людзі ў масках і пальчатках на вуліцы, спусцелыя бары і рэстараны, закрытыя межы... Разам з укладам жыцця змяніліся і нашы выдаткі. Як менавіта? Ва ўсіх па-рознаму, у кагосьці моцна, у іншага — усё амаль па-ранейшаму. Мы запыталіся ў пяці беларусаў, як ім жывецца сёння і на што яны выдаткоўваюць (або не) свае грошы.

Тамара Іосіфаўна, 64 гады, пенсіянерка:

— У маіх выдатках амаль нічэга змен няма. Я пенсіянерка і кіруюся памерам сваёй пенсіі. Да таго ж мой лад жыцця амаль не змяніўся. Менш стала кантактаў — гэта так. Калі раней я хадзіла на лекцыі па сусветнай мастацкай культуры ва Універсітэт трэцяга ўзросту, на заняткі ў бібліятэку, то цяпер такога няма. Затое я з надыходам вясны стала ездзіць на лецішча — два-тры разы на тыдзень у электрычцы і стараюся выязджаць раніцай, калі менш народу. Заўсёды надзяваю маску і ў грамадскім транспарце, і ў краме. Дзве шматразовыя маскі я пашыла сама, адну купіла — так што шмат грошай на іх не пайшло. Купляю вільготныя антысептычныя сурвэткі, гаспадарчае мыла — і ім мыю, апроч іншага, яшчэ і агародніну і садавіну з крамы. Стараюся купляць прадметы гігіены на зніжках, але заўважыла апошнім часам, што на расійскія тавары зніжкі чамусьці не распаўсюджваюцца.

У цэлым, амаль уся мая пенсія ідзе на прадукты. Вось заплаціла за камуналку 120 рублёў, астатняе ідзе ў аснoўным на ежу, і больш за ўсё — на малочныя прадукты, якія часта ўжываю, бо параіў эндакрынолаг.

Вось цяпер за лецішча трэба будзе заплаціць падатак. І яшчэ праз пару месяцаў будуць траты на медыцыну. Я хаджу да платнага эндакрынолага, таму да жніўня трэба будзе адкласці дзесьці 200 рублёў на візіт да доктара і на аналізы. І яшчэ трэба будзе прыблізна 100 рублёў на стаматолага. А вось на аптэку я выдаткоўваю няшмат, бо лекаў амаль не купляю — толькі таблеткі ад ціску і вітамін Д.

stock.adobe.com

Дзмітрый Клімковіч, адзін з кіраўнікоў праекта «Цэнтр актыўнага даўгалецця»:

— Я сказаў бы, што расходы апошнім часам зменшыліся — і ў «Цэнтра актыўнага даўгалецця», і ў мяне асабіста. У першую чаргу таму, што мы цяпер працуем анлайн. Выкладаем мовы і нават ёгу і зумбу праз інтэрнэт. Таму істотна скарацціся транспартныя выдаткі ў нашых работнікаў, а ў мяне, напрыклад, выдаткі на бензін. Я жыву за горадам, і раней яны былі значна вышэйшыя. У офісе скарацціся спажыванне электраэнергіі і вады.

Да таго ж, мы ўсе зараз стараемся эканоміць, бо не ведаем, што нас чакае заўтра. Не ўкладаем рэсурсы ў дойгатэрміновыя праекты... Ды і кожны з нас на асабістым узроўні імкнецца меней выдаткоўваць цяпер, таму што людзі не ўпэўненыя ў заўтрашнім дні.

Ларыса, 32 гады, вэб-дызайнер:

— Я апошні месяц ездж ў офіс толькі 1-2 разы на тыдзень, астатні час працую дома. Але не сказала б, што мае выдаткі неяк моцна пры гэтым зменіліся. Так, на нетыя грошай стала сыходзіць менш, але пры гэтым павялічыліся іншыя траты. Напрыклад, на грамадскі транспарт я зараз амаль не трачуся, але з-за таго, што баюся захварэць, стала часцей заказваць таксі, каб даехаць да работы.

На ежу грошай стала выходзіць менш, бо дома гатаваць больш выгадна, чым абедаць у сталовай ці кавярні, як я рабіла гэта раней. Затое, падазраю, вырасцуць камунальныя плацяжы... Павялічыліся траты на прадметы гігіены, антысептыкі. Вітаміны вось дарагія купіла, але гэта адзінкавая пакупка. Затое я перастала хадзіць па крамах, таму больш няякіх спантанных пакупак. Наогул, я гэтай вясной не купіла сабе нічога новага з адзення і абутку. Лічу правільнай такую стратэгію.

Аксана Максімчук (пра сям'ю з трох чалавек):

— Траты ў нашай сям'і гэтай вясной знізіліся, і нашмат. Перш за ўсё таму, што мы сталі больш эканоміць. Сталі радзей хадзіць у краму, а перад пакупкамі складаем спіс таго, што сапраўды цяпер неабходна, каб менш праводзіць там часу. Да таго ж я добра праверыла ўсе свае запасы ў халадзільніку і на паліцах, і аказалася, што іх не так ужо і мала. Гатую цяпер з іх. Увогуле, на ежу стала выдаткоўвацца нашмат менш грошай з сямейнага бюджэту. Менш стала трат і на цацкі для дзіцяці. У кіно мы цяпер не ходзім, а глядзім фільмы ў інтэрнэце. І наогул, усе небабязковыя выдаткі паставілі на паўзу. Вось ацяплялны сезон скончыўся, так што і за кватэру выйдзе менш плаціць...

Аляксандр, 40 гадоў, тэхнічны дырэктар:

— Я цяпер працую на ўдалёнцы і заўважыў, што стаў выдаткоўваць значна больш грошай на ежу. Гэта таму, што я купляю гатовую ежу ў гіпермаркеце, у аддзеле, які раней называўся кулінарыяй. І гэта аказалася дарагі, чым абедаў ў кафэ, бо я заўсёды абедаў там па абедзенным меню — так атрымлівалася значна танней. Вядома, што сам гатуе, той цяпер можа сэканоміць, але гэта не мой выпадак. Дрэнна і тое, што гатовая ежа доўга не захоўваецца, таму я вымушаны даволі часта хадзіць у краму. А вось выдаткі на бензін зараз рэзка ўпалі. Ну а больш, мабыць, у маіх тратах нічога не памянялася.

❍ ДАРЭЧЫ

Банк прааналізаваў траты сваіх кліентаў

Адзін з буйных банкаў пры дапамозе праекта Big Data адсачыў выдаткі сваіх кліентаў і апублікаваў адпаведную справаздачу. На яе падставе можна выразна прасачыць змены ў нашым з вамі жыцці, якія адбыліся сёлета.

Як аказалася, у лютым і сакавіку кліенты банка на траціну, у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года, зменшылі свае аперацыі па заказе таварaў на Aliexpress. Акрамя таго, рэзка скарацціся аперацыі фізічных асоб на куплі білетаў у кінатэатры (на 30 %), квіткоў на чыгуначныя цягнікі (на 40 %), на самалёты (на 51 %). Таксама на 46 % знізіліся траты на адзенне і абутак, на 19 % — на спарттавары і на 52 % — на ўстаноы грамадскага харчавання.

А вось колькасць плацяжоў па аплаце дастаўкі прадуктаў, пачыналючы з першага тыдня сакавіка, перавысіла аналагічныя леташнія паказчыкі на 30 %. Колькасць аперацый у аптэках таксама павялічылася — на 37 %.

У красавіку таксама на 30 % павялічылася колькасць аперацый на чалавека ў сферы паслуг таксі, у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. І асаблівы рост попыту на таксі ў сакавіку—красавіку быў ва ўзроставых групах 60—70 і 70—80 гадоў.

Святлана БУСЬКО.

Новыя выданні

Пра жахлівыя выпрабаванні

Выдавецтва «Деловая печать» выпусціла новую кнігу Зіновія Прыгодзіча. Пад адной вокладкай — нарысы і інтэрв'ю. Аснову кнігі складаюць тэксты, якія раказваюць пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Чытаем у выдавецкай анатацыі: «Кніга «Трывожная памяць» апавядае пра людзей, якія прайшлі праз жахлівыя выпрабаванні Вялікай Айчыннай вайны. Адны — у партызанах і на фронце, другія — дзецьмі — падчас фашысцкай акупацыі. Перажытае налажыла глыбокі адбітак на іх душэўны і духоўны свет, на іх далейшы лёс».



Як жывы паўстае перад чытачом у расповедзе Зіновія Прыгодзіча народны пісьменнік Беларусі Васіль Быкаў («Вайна — не займальная прагулка»). «З любоўю і нянавісцю зямною» — дыялог з вялікім паэтам сучаснасці і сябрам Генадзем Бураўкіным. Вось што, у прыватнасці, паэт сказаў свайму сураэмоўцу: «...Чаму я так многа ўспамінаю праз тыя цяжкія і незабыўныя гады? Таму што думаю: менавіта тады пачала фарміравацца любоў і нянавісць мае і многіх маіх равеснікаў».

У кнізе Зіновія Прыгодзіча чытача чакаюць сустрэчы з народным мастаком СССР Міхаілам Савіцкім, празаікам Барысам Сачанкам, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Янкам Сіпаковым, пісьменнікам-франтавіком Алесем Савіцкім, легендарным скульптарам і архітэктарам Леанідам Левіным, кампазітарам Ігарам Лучанком, сынам Якуба Коласа — дактарам тэхнічных навук Міхаісём Канстанцінавічам Міцкевічам і іншымі цікавымі сураэмоўцамі, праз якіх аўтар «Трывожнай памяці» вымалёўвае партрэт блізкага і зразумелага яму часу.

Мікола БЕРЛЕЖ.

Жыровіцкаму манастыру прысвячаецца

Выдавецтва «Беларусь» да юбілейных дат, звязаных з Жыровіцамі, выпусціла яшчэ адну кнігу.

Невялікага памеру альбом «Жыровіцкі Свята-Успенскі манастыр» пабачыў свет на трох мовах — беларускай, рускай і англійскай. Наклад выдання — 800 экзэмпляраў. Аўтар тэкстаў — Аляксандр Ярашэвіч. У кнізе змешчаны рэпрадукцыі даўніх ілюстрацыйных матэрыялаў і сучасныя здымкі А. Дрыбаса, Д. Ласько. Выпуск выдання ахыццёўлены па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Несумненна, выданне будзе запатрабавана, знойдзе свайго чытача і сярод наведвальнікаў свята месца. Пераконвае ў гэтым і грунтоўны тэкст да фатаграфічных выяў. А. Ярашэвіч раказвае хоць і коратка, лаканічна, але вельмі насычана, грунтоўна пра самі Жыровіцы (старажытны і старэйшы ў Беларусі). А. Ярашэвіч нагадвае, што «дзякуючы цудатворнаму абразу Маці Божай і шчодрасці фундатараў манастыр стаў буйнейшым цэнтрам рэлігійнага і культурнага жыцця; у ім шмат разоў адбываліся кангрэгацыі базыльян, пачынаючы з 2-й (1629, 1658, 1659, 1661, 1675, 1679, 1694). З 1636 года богаслужэнні праводзіліся на двух абрадах — грэчаскаму і рымскаму».

Сёння ва ўмовах пандэміі каранавіруса асабліва важным фактам падаецца выданне такога альбома.

Сяргей ШЫЧКО.

Нашы адметнасці

Фантаны трох стагоддзяў

Рознага росту, ад некалькіх сантыметраў да дзясятка метраў у вышыню — такія фантаны ўпрыгожваюць вуліцы і плошчы Мінска, з'яўляюцца часткай ландшафтных кампазіцый паркаў і сквераў. Разнастайныя па выглядзе і тэхнічным выкананні, яны створаныя, каб аздобіць гарадскі пейзаж і адлюстраваць найбольш яскравыя падзеі гісторыі нашай сталіцы.

Самы стары фантан у Мінску адкрылі ў год пуску першага гарадскога водаправода з артэзіянскай вадой. Размешчаны ён побач з сённяшнім будынкам Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Фантан быў пабудаваны ў 1874 годзе, пра што сведчыць шыльда пад шумнымі патокамі вады.

Самы малады фантан днямі з'явіўся на набярэжнай Свіслачы, каля парку імя Горкага. Дакладней кажучы, ён узнік пасля рэканструкцыі таго невялічкага, які неклі існаваў тут раней. Але гэтае «раней» бачыцца ўжо такім далёкім, што збудаванне адразу пачалі называць новым. У начную пару сотні струменяў падсвечваюцца рознакаляровымі святлодыёдамі. Такія крыніцы святла будуць працаваць і ў маразы, калі фантан давядзецца часова спыніць — яны па-свойму перададуць маляўнічую дынаміку імклівай вады.

Яўген ПЯСЕЦКІ, фота аўтара.

Будзь у курсе!

Сацыяльная рассадка — да 1 ліпеня

Беларуская чыгунка зноў падоўжыла тэрмін дзеяння новай схемы рассадкі пасажыраў у цягніках, гэтым разам да 1 ліпеня, паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі.

Рассадка па новай схеме была ўведзена БЧ з 15 красавіка з мэтай захавання пасажырамі неабходнай сацыяльнай дыстанцыі ў купэйных, плацкартных вагонах і ў вагонах з месцамі для сядзення.

Мера скіравана на захаванне здароўя грамадзян, профілактыку распаўсюджвання вірусных інфекцый сярод пасажыраў беларускай магістралі, а таксама стварэнне камфортных умоў праезду ў цягніках з нумаравaнымі месцамі.

Нагадаем, новая схема прадугледжвае размяшчэнне не больш чым двух пасажыраў у купэ, не больш чым трох чалавек у адным адсеку плацкартнага вагона. Пасажырам, якія аформілі білеты ў адной замове, дазволена купля трох ці чатырох месцаў у купэ, калі да гэтага там не было прададзена ні аднаго месца.

Пры афармленні білетаў у вагонах з месцамі для сядзення ў двухмесным радзе пасажыр будзе размешчаны каля акна. У трохмесным — адзін чалавек каля акна, другі — праз месца каля праходу (сярэдні рад застаецца незанятым).

Новая схема рассадкі выкарыстоўваецца пры афармленні праязных дакументаў як у чыгуначных касах, так і праз інтэрнэт.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ООО «Центр Белинвентаризация» г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1

✓ Раздел и установление порядка пользования земельным участком
✓ Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения
✓ Пересчет долей в связи с изменением капитального строения

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО НТК «АЛЕСЯ», 8 (0232) 29 51 12

№ лота	Наименование объекта	Начальная стоимость лота, бел. руб. с НДС	Сумма задатка, бел. руб.
1	**Изолированное помещение (торговое помещение) с инв. № 350/D-353672 площадью 69,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Пенязькова Д.Н., 59-1а. Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000006005342 площадью 0,1200 га**	229 500,00	22 950,00
Срок подачи заявления	**По 24 июня 2020 г.** в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1		
Дата, время и место проведения аукциона	**26 июня 2020 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1		
Номер р/с для перечисления задатка	BY71BPSB30121783390109330000 в РД № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «*Звязда*» *от 02.06.2020 г.*		
Условия продажи	Объект продается в собственность. Цель использования – любая, кроме розничной торговли продовольственными товарами и общественного питания. Шаг аукционных торгов – 5 %. Заключить договор купли-продажи в течение 10 (десяти) календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. Победителю аукциона предоставляется рассрочка платежа на 5 (пять) месяцев. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона		

Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 50 56 62, (029) 341 15 45

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Столбцовского филиала Минского облпотребобщества (продавец)

проводит открытый аукцион по продаже здания магазина № 172

(составные части и принадлежности: 2 склада, уборная)

с инв. № 622/С-17995 общей площадью 94,6 кв. м,

расположенного на земельном участке с кадастровым номером 625482809601000120 площадью 0,1350 га (право аренды по 07.03.2070)

по адресу: Минская область, Столбцовский район, Литвенский с/с, ар. Рочевичи.

Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: ограничения прав на земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона ручья № 2 пл. 0,1350 га), охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0067 га, охранная зона газораспределительной системы пл. 0,0033 га.

Начальная цена с НДС (20 %) – **25 000,00 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **2 500,00 бел. руб.**).

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **06.07.2020** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **05.07.2020** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.

Этнаскарбонка

Як зазірнуць у рукапісы класікаў?

Якія каштоўнасці захоўвае Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва?

ВІЗІТОЎКА ЮБІЛЯРА

Сёння гэта ўстанова з'яўляецца сапраўднай культурнай скарбніцай. За 60 гадоў існавання Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва сабраў больш за 520 фондаў і калекцый. Яны створаны на аснове асабістых архіваў выдатных асоб, а таксама дакументаў творчых саюзаў, выдавецтваў, тэатраў, рэдакцый часопісаў і газет, Беларускага музея імя Івана Луцкевіча ў Вільні, кінастудыі «Беларусьфільм», Белдзяржфілармоніі, Беларускай акадэміі музыкі і іншых. Напрыклад, тут можна папрацаваць з асабістымі архівамі і зборамі пісьменнікаў Я. Купалы, Я. Коласа, А. Адамовіча, М. Гарэцкага, В. Быкава, У. Караткевіча, кампазітараў А. Багатырова, Г. Вагнера, Я. Глебава, В. Залатарова, Ю. Семянякі; акцёраў і рэжысёраў Ф. Абуховіч, А. Кістава, А. Клімавай, Г. Макаравай, П. Малчанава, Б. Платонава, К. Саннікава, С. Станюты, У. Уладамірскага, Р. Янкоўскага; спевакоў Л. Александроўскай, І. Балоціна, С. Друкер, М. Забэйды-Суміцкага, Р. Млодак; мастакоў і скульптараў І. Ахрэмчыка, В. Волкава, А. Глебава, А. Грубэ, А. Кашкурэвіча, А. Марыкса, С. Селіханава, А. Тычыны і многіх іншых.

Архіў-музей захоўвае рарытэты, датаваныя XIX — пачаткам XX стагоддзя. Гэта рукапіс другой частка «Беларускага архіва старажытных грамат», падрыхтаваны І. Грыгаровічам (1825 год); рукапісная «Беларуская хрэстаматыя» 1889 года, якую «сабраў і ўпарадкаваў Браніслаў Эпімах-Шыпіла»; запісная кніжка сям'і Кастравіцкіх, у якой захоўваюцца лісткі з аўтографамі паўстанцаў 1863 года (спачатку яна належала дзеду, пасля бацьку і нарэшце пісьменніку, мастаку, грамадскаму дзеячу Казіміру Кастравіцкаму — Карусю Каганцу); біяграфічныя дакументы Цёткі; рукапісны часопіс беларускіх студэнтаў-нарадавольцаў «Гоман» (1884); ліст М. Шагала свайму настаўніку Ю. Пэну з Парыжа (1927—1928) і іншыя дакументы. Сярод многіх унікальных кніг і выданняў, якія захоўвае архіў-музей — газеты «Наша доля», «Наша ніва», «Вольная Беларусь», «Звон»; часопісы «Маладняк», «Узвышша»; старавераская перадрукоўка Псалтыра 1645 года, выкананая ў 1849 годзе, восем выданняў (пачынаючы з 1898 года) паэмы «Тарас на Парнасе», першыя выданні твораў М. Багдановіча, Я. Купалы, Я. Коласа, кнігі В. Дастоўскага, Я. Лёсіка і многія іншыя.

У музейным фондзе каля тысячы прадметаў дзесяткаў літаратуры, культуры, мастацтва: вазы, карціны, фалерыстыка (узнагароды), строі, якія належалі выканаўцам народных песень, тут набярэцца цэлая калекцыя друкарскіх машынак і гадзіннікаў, захоўваюцца музычныя інструменты В. Яфімава, М. Шнэйдэрмана, В. Скорабагатава.

Адным з найбуйнейшых сховішчаў дакументальных крыніц па гісторыі літаратуры, выяўленчага мастацтва, тэатра і музыкі Беларусі карыстаюцца айчыннымі і замежнымі даследчыкі. БДАМЛМ супрацоўнічае з многімі беларускімі і замежнымі ўстановамі, удзельнічае ў рэспубліканскіх і міжнародных канферэнцыях, выдае дакументальныя зборнікі.

ГІСТОРЫЯ

Доўгі час у Беларусі архіўныя ўстановы не камплектаваліся асабістымі архівамі, унікальныя дакументы, фатаграфіі, рукапісы, рэдкія выданні, што захоўваліся ў прыватных уладаннях, маглі гінуць. Шмат рукапісаў ляжала ў шафах літаратурна-мастацкіх часопісаў і газет. Шафы бясконца папаўняліся і паўставала пытанне, што з гэтым рабіць, бо такія зборы нельга было аднесці да афіцыйных дакументаў, але ж яны мелі каштоўнасць — так і з'явілася думка аб стварэнні спецыялізаванага архіва. 9 чэрвеня 1960 года такая ўстанова была створана пастановай Савета Міністраў БССР.

У гэтым жа годзе ў межах узаемаабмену дакументамі паміж нацыянальнымі рэспублікамі ў Беларусь паступіла частка архіўных дакументаў Беларускага музея імя Івана Луцкевіча, створана калісьці ў Вільні. Дзякуючы стараням братоў Луцкевічаў былі захаваны вельмі значныя часткі асабістых архіваў Цёткі, Тарашкевіча, Пастоўскага, Жаўрыда, асобныя рукапісы Купалы і Коласа, Бядулі, Канстанцыі Буйло і многіх іншых. На вялікі жаль, гэты музей быў ліквідаваны ў 1945 годзе, а яго архіўныя фонды падзелены, частка з іх засталася ў Літве.

Пачалося выяўленне крыніц камплектавання дакументамі асабістага паходжання. Архівісты шукалі спадчыннікаў, хто мог валодаць такімі дакументамі, працаваць непасрэдна з самімі фондастваральнікамі — старэйшымі пісьменнікамі, кампазітарамі, мастакамі. Але людзі гатовы былі перадаваць не толькі дакументы, але і рэчы. На той час творчых музеяў было няшмат. І архівісты ўзялі на сябе абавязак збіраць і рэчы, якія належалі вядомым, выдатным асобам і ў будучым маглі б дапоўніць, упрыгожыць любую музейную калекцыю. У 1976 годзе была прынята пастанова Савета міністраў, падмацаваная рашэннем ЦК КПБ (па ўспамінах старэйшых супрацоўнікаў, сам Пётр Машэраў да гэтага прычыніўся), па стварэнні архіва-музея. Нават была задума падабраць у гораздзе будынак з выставачнымі заламі, але яна не рэалізаванай і дагэтуль. Установа так і засталася музем-сховішчам, але яе скарбы запатрабаваныя. Напрыклад, у БДАМЛМ захоўваюцца асабістыя фонды мастакоў, эскізы для многіх вядомых карцін. Так, сама работа Волкава «Мінск. З ліпеня 1944 года» знаходзіцца ў экспазіцыі Нацыянальнага мастацкага музея, а эскізы дэталяў, герояў карціны і дакументы мастака зберагае Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. Дзякуючы копіям і муляжам, зробленым на аснове захаваных тут скарбаў, многія музеі (у тым ліку краязнаўчыя, школьныя) могуць папаўняць свае экспазіцыі, ствараць часовыя выстаўкі.

НЕКРАНУТАЯ СПАДЧЫНА?

— Пошук і збіранне каштоўных дакументаў ніколі не спыняецца?

— Мы працуем з дакументамі, якія да нас паступаюць, вывучаем адрасы на канвертах карэспандэнтаў, чытаем успаміны, газетныя публікацыі, сустракаемся з людзьмі, якія былі знаёмыя з дзеячамі літаратуры і мастацтва, могуць даць нам адрас пэўнай крыніцы, — расказвае **дырэктар Беларускага дзяржаўнага архіва-музея Ганна ЗАПАРТЫКА.** — І гэтыя пошукі не толькі ў межах Беларусі. Сёння многа фондаў, якія створаны дзякуючы захаванаым асабістым архівам, сабраным, па сутнасці, з усіх рэспублік былога СССР. Яшчэ ў 70—80-я гады архівісты многа падарожнічалі, перапісваліся, атрымлівалі дакументы. З Яраслаўля прывезлі рэчы і архіў сям'і Багдановіча, з Саратава — архіў Язэпа Дылы, з Ташкента — Сцяпана Ліхадзіеўскага, з Масквы — Адама Бабарэкі, Аляксея Каўкі, Ларысы Аляксеевай. З Санкт-Пецярбурга паступіў унікальны, адзін з самых вялікіх, архіў Лукаша Бэндэ, дзе ёсць уласныя рукапісы, фатаграфіі і асабістыя дакументы і цэлая калекцыя сабраных ім дакументаў дзесяткаў літаратуры і мастацтва ад сярэдзіны XIX стагоддзя да 1940-х гадоў. Там ёсць копіі і шмат арыгіналаў, рукапісы Максіма Гарэцкага, Паўлюка Труса, Аркадзя Куляшова і многіх іншых. З Латвіі прыйшлі архівы паэта Пятра Сакола, з Польшчы — Сакрата Яновіча, Юрыя Туронка. Былі паступленні з Вялікабрытаніі, Злучаных Штатаў, Аўстраліі. Трэба выказаць удзячнасць усім, хто нам дапамагае камплектаваць фонды, — Вітаўту Кіпелю, Янку Запрудніку, Адаму Мальдзісу.

— Дзякуючы архіву можна ўбачыць творы пісьменнікаў, некранутыя цэнзурай. Ці моцна яны могуць розніцца ад таго, што было надрукавана?

— Такім узорам несупадзення можа быць, напрыклад «Эпітафія без елея. Страницы воспоминаний партизана» літаратуразнаўца Навума Перкіна. У свой час успаміны друкаваліся, але былі моцна адцэнзураваныя, арыгінал вельмі пацярпеў. У 2013 годзе з нашага архіва ўзяты арыгінал рукапісу і выдадзены. У зборніку «Над хвалямі Серабранкі», які падрыхтаваны дзякуючы асабістаму архіву Івана Козела, некаторыя з яго п'ес можна пабачыць упершыню. Інстытут літаратуры пры падрыхтоўцы збору твораў абавязкова працуе ў архіве. Важна прасачыць тэкстаралагічныя змены, абазначыць у каментарыях, гэта неабходна для спасцяжэння творчай лабараторыі пісьменніка. Зараз супрацоўнікі Інстытута літаратуры працуюць з фондам Янкі Брыля, раней такая работа вялася з фондамі Івана Шамякіна, Івана Навуменкі, Івана Мележа.

— На які час яшчэ даследчыкам хопіць работы з архіўнымі дакументамі? Якія тэмы наогул не раскрытыя?

— Калі я прыйшла ў архіў на работу адразу пасля вучобы ва ўніверсітэце, адчула, як мала мы ведаем пра нашу літаратуру. Наколькі яна была «шмат-населеная»! Мы мелі не толькі магутны лес, але і падлесак, які не паспеў разгледзець свае магчымасці, талент. Адным аўтарам перашкодзілі рэпрэсіі, другім — вайна. Калі Янка Брыль гаварыў, што ў яго было пасведчанне пісьменніка пад нумарам 6, ад гэтага станавілася крыху жахліва. Ці хто задумваўся, чаму пісьменнікаў было так мала ў параўнанні з колькасцю рускіх? Калі мне трэба было заглыбляцца ў праблемы камплектавання, чытаць дакументы і бясконца ўдакладняць біяграфічныя звесткі, я раптам заўважыла, што многія пісьменнікі апынуліся на новабудоўлях Сібіры, Далёкага Усходу, Поўначы. Многія з іх не былі ўзноўлены ў членстве Саюза пісьменнікаў, хоць у тыя часы гэта было вынаходлівым, але архівісты сталіся як мага болей захаваць, наш музей-архіў камплектаваўся і такімі фондамі. Пра многіх асоб сталі ўспамінаць толькі ў канцы 80—90-х гадоў. Сёння іх імёны вядомыя. Іх фонды бераглі у нас, яны запатрабаваныя даследчыкамі, тымі, хто вывучае гісторыю літаратуры, працуе ў акадэмічных інстытутах, на кафедрах гуманітарных ВНУ, краязнаўцамі. Студэнты пішуць курсавыя і дыпломныя на базе дакументаў, якія захоўваюць фонды.

Сёння можна разглядаць многія праблемы і пад іншымі ракурсамі. Трэба вывучаць у комплексе ўласна гісторыю, паўсядзённасць, жыццё грамадства на пэўным адрэзку часу, канкрэтную асобу пісьменніка. А гэта і ёсць уплывы на літаратуру, на жанры, на сюжэты і г. д. Калі пачнём стваральскі свайо энцыклапедыю лёсаў, разгорнутых, панарамных даследаванняў, мы зможам зацікавіць і сучаснага чытача, і наступныя пакаленні нашай літаратурай. Яна вельмі багатая. Даследаванні павінны быць сучаснымі, з улікам тых дакументаў, якія сёння адкрытыя. Літаратура становіцца іншай, але тое, што было ў нашай гісторыі, мы павінны вывучаць: выдаваць кнігі, зборы твораў, каб не забывацца, не разрываць гэтыя перыяды, пакаленні.

— Але разрыў адбыўся. Кнігі знішчаліся, часопісы і выданні забіралі з бібліятэк. Многія асобы проста не паспелі выдаць свае творы. Пэўны час мы не ведалі пра існаванне некаторых пісьменнікаў, пэўнай літаратуры. Што сёння робіцца для таго, каб ліквідаваць прабелы?

— У двух тамах, якія падрыхтавалі супрацоўнікі архіва, прысвечаных Адаму Бабарэку, вялікая колькасць рукапісаў апублікавана ўпершыню. Гэта выдатны літаратурны крытык, філосаф, паэт. Ён тлумачыў сучаснаму чытачу творы Кузьмы Чорнага, Язэпа Пушчы, Уладзіміра Дубоўскі, даносіў нацыянальную ідэйную значнасць. Да таго, як яго асабісты архіў паступіў да нас, рэдкія людзі маглі бачыць ці меркаваць, што захавалася працы — не толькі тыя, што выйшлі ва «Узвышшы» ці «Маладняку», але і тое, чаго крытык не змог апублікаваць, пра што толькі марыў. Гэта і тыя тэксты, якія былі напісаны ім у высылцы ў 1930-я гады, перапіска.

У нас ладзіцца многа выставак. На экскурсіі прыходзяць студэнты і школьнікі. Пра кожны з фондаў можна рабіць асобныя перадачы. Мы рыхтуем зборнікі. «Сцежкамі жыцця» — архіў Паўліны Мядзёлкі, відомай дзяячкі беларускага адраджэння. Пад адной кніжнай вокладкай таксама можна знайсці цэлы архіўны збор Зоські Верас, у свой час яго перадала сама пісьменніца з Вільні. У нас захаваліся выданні 20-х гадоў з працамі Усевалада Ігнатоўскага, дзякуючы чаму мы змаглі падрыхтаваць адпаведны зборнік. Разам з супрацоўнікамі Акадэміі музыкі працавалі над кнігай, у якой сабраны ўспамінаы пра Анатоля Багатырова і рэдкія фатаграфіі і дакументы, якія былі перададзены ў архіў яго спадчыннікамі. На падставе нотных рукапісаў, якія знаходзяцца ў розных фондах, выдадзены «Творы беларускіх кампазітараў XIX—XX стагоддзяў».

— Сучасныя тэхналогіі дапамагаюць вяртаць спадчыну?

— Так, мы працуем з цэлым светам. Калі выяўляем дакументы, якія датычаюцца жыцця і дзейнасці нашых пісьменнікаў, у дзяржаўным сховішчы іншай краіны стараемся атрымаць электронныя копіі. Копіі могуць паступаць і ад прыватных асоб. Напрыклад, дзякуючы сям'і сябра Уладзіміра Караткевіча Фларыяна Няўважнага, мы атрымалі каштоўныя электронныя копіі. Але сёння на 98 працэнтаў наша праца звязана з папяровымі дакументамі. Здаецца, разбіраецца агромністы (да 100 архіўных скрынак) фонд Рыгора Барадуліна, апрацаваны фонд Генадзя Бураўкіна. Разбіраецца архіў Ніла Гілевіча. Паступаюць да нас архівы многіх сучасных дзеячаў. Сямён Букчын прыходзіць да нас, можа расказаць багата цікавых гісторый, пракансультаваць. Гэта вельмі добра, калі мы можам працаваць з самім фондастваральнікам. Праца з традыцыйнымі папяровымі дакументамі яшчэ не хутка сыдзе з архіўнай рэальнасці.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Віртуальная вандроўка

Дворыкі з сюрпрызам, замкавая гісторыя і беларускі сфінкс,

або Па Беларусі на канапе

Прайсціся па губернскім горадзе ці паглыбіцца ў старажытную гісторыю, даведацца, куды зьбочыць з «нагуляных» маршрутаў», каб знайсці цікавыя аб'екты, запланаваць будучыя падарожжы і пазнаёміцца з дасведчанымі гісторыкамі, краязнаўцамі можна было падчас серыі антыкрызісных віртуальных zoom-вандровак «Гарады Беларусі вачыма мясцовых экскурсаводаў», які прайшоў у межах адукацыйнага беларускага анлайн-фэсту «Вышка».

ЗАВІТАЕМ У НОВЫ СВЕТ?

Гарадзенскі краязнавец, гісторык, экскурсавод Міхаіл НАРЫКЕВІЧ запрасіў прагуляцца па мікрараёне, за якім замацавалася назва «Новы свет», які гараджане сталі актыўна абжываць з канца XVIII стагоддзя. Менавіта ў гэты час у Гродне ладзіцца буйная рэформа, у горад прыязджаюць замежнікі: галандцы, швейцарцы, немцы, французы, — бо ствараліся добрыя ўмовы для працы і можна было добра зарабіць. Вось толькі тагачасная спроба стварыць нешта накшталт «парка высокіх тэхналогій» аказалася нявыдалай. Рэформы не былі праду маныя, прадукцыя, якая выраблялася (а гэта пераважна прадметы раскошы), ляжала на складах, ды тутэйшыя жыхары не надта шанавалі тавары айчыннай вытворчасці.

Новы свет знаходзіцца літаральна за 500 метраў ад чыгуначнага вакзала. Менавіта тут быў створаны першы на тэрыторыі сучаснай Беларусі заапарк.

Захавалася загарадная рэзідэнцыя кароля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага (дарэчы, кароль будаваў тры рэзідэнцыі: Станіславава, Аўгустова і Панямунь). Пазней, калі Рэчы Паспалітай не стала, сядзібу кароля купіў Францішак Друцкі-Любецкі, які быў ініцыятарам стварэння Аўгустоўскага канала. А ўжо яго ўнук Уладзіслаў (аматар здаровага сподсаў жыцця і гаспадар першага аўтамабіля ў Гародні) пачаў прадаваць і здаваць у арэнду тутэйшыя землі. Дарэчы, калі Уладзіслаў трагічна загінуў, раздаваць яго заўчасную смерць клікалі нават Артура Конан Дойла...

У новым элітным раёне сяліліся багатыя людзі, прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў, таму тут захавалася багата шыкоўных будынкаў. Асобныя зроблены ў стылі рускага мадэрну, іншыя — канструктывізму. Дамкі з вялікімі ламанымі дахамі нагадаюць пра 1920—30-я гады, калі ствараліся шыкоўныя асабнякі ў закаханскім стылі. Цагляныя будынкі сведчаць пра тое, што ў Друцкіх-Любецкіх быў свой завод па вырабе будматэрыялаў. Па райнчыку цікава прагуляцца, разглядаць цікавыя дэталі: ліштвы, аканіцы, балкончыкі, тэрасы. Можна паспрабаваць адшукаць дом з драўлянымі разнымі цмокамі, прайсціся па адрасах, дзе жылі вядомыя людзі. Напрыклад, чатыры гады тут правяла сям'я Багдановічаў, захаваўся дом Рыгора Шырмы.

Сёння гісторыкі занепакоены будучым Новага свету. Адзін з кавалкаў мікрараёна — Залатая горка — (дзе сялілася заможныя людзі) цяпер з сумам называюць «лысай горкай», бо старыя забудовы былі знішчаны.

Суполка архітэктараў спрабавала прапісаць некалькі сцэнарыяў па развіцці гэтага мікрараёна. Па адным з іх надзеі ўскладаюцца на дзяржаву — што дамы будуць выкуплены за яе кошт, а пасля выкарыстоўвацца ў турыстычных мэтах: у іх размесцяцца кавярні, музеі, культурніцкія ўстановы. Па другой версіі, дамы будуць выкуплены і рэканструяваны заможнымі людзьмі. А можа, трэба проста стварыць належную інфраструктуру, каб цяперашнія гаспадары маглі карыстацца ўсімі выгодамі і пры гэтым самі дбалі аб захаванні будынкаў?

НЕДААЦЭНЕНАЯ АРХІТЭКТУРА

Праблему з захаванням старых будынкаў закрануў падчас zoom-вандроўкі і **гомельскі краязнавец, гісторык, экскурсавод Яўген МЕРКЕС.** У Гомелі не раз уздымалася пытанне аб каштоўнасці драўлянай архітэктуры. Такія дамы зносяцца альбо псуюцца ўладальнікамі, якія аўтэнтычныя вокны мяняюць на пластык, абшываюць драўляныя дамы сучаснай вагонкай або сайдынгам. Тут таксама мараць аб стварэнні скансэна.

Краязнавец спрабуе абвергнуць думку турыстаў пра тое, што ў Гомелі няма чаго глядзець акрамя палаца Румянцавых-Паскевічаў. Ёсць шэраг цікавых культавых пабудоў. Напрыклад, Ільінская стараабрадніцкая царква XVIII стагоддзя. А пра Спаса-Праабражанскі храм на вуліцы Пралетарскай, напэўна, і не ўсе месцічы ведаюць, бо ён схаваны за іншымі будынкамі.

Аматары прыгожых фота ў «Інстаграме» цікавяцца «гомельскімі Альпамі» — насамрэч, беласнежныя горы на ўскрайку горада — усяго толькі адвалы хімзавода. Часам турысты могуць спытаць і пра «гомельскія яблыкі» — гэта вялікія 2-3-метровыя бетонныя фігуры. А ў цэнтральным скверы можна знайсці макеты вядомых у свеце будынкаў — напрыклад, Пізанскую вежу і пірамідзы са сфінксам.

БЕЛАРУСКАЯ АДЭСА?

Адна з асаблівасцяў Брэста — нумарацыя дамоў. Яна праваняцотная і захоўвалася да 1960-х гадоў. А ўжо ў новых раёнах будынкі мелі леваняцотную нумарацыю. Больш за тое, у самім дамах нумары квартэрам давалі з поўначы па гадзіннікавай стрэлцы. Сёння гэтая асаблівасць ужо лічыцца каштоўнасцю, якую варта захаваць.

Будзеце гуляць па Брэсце — звярніце ўвагу на назвы вуліц, ужо па іх можна прасачыць гісторыю горада. Толькі за мінулае стагоддзе яны маглі мяняцца чатыры і больш разоў (пры польскай, савецкай уладзе, у гады вайны і пасля вызвалення). Таму цяпер на будынках размяшчаюць шыльды з указанненм папярэдніх найменняў.

Берасцейская экскурсаводка, выкладчыца Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта Таццяна ШАЎЧУК раіць адысці ад раскручаных турыстычных аб'ектаў ці той жа Алеі ліхтароў і зазірнуць у мясцовыя дворыкі. Дарэчы, там можна ладзіць асобную экскурсію, нездарма некаторых з іх параўноўвалі з адэскімі. Тут вы зможаце пабачыць асобныя ўваходы ў кожную з кватэр, што месцяцца на розных паверхах. Калі пасля вайны праходзіла ўчучыленне, ніхто не хацеў аквяраваць плошчай, дамы прырасталі розныміпрыбудовамі.

Асобная экскурсія можа быць прысвечана і балончыкам — цікава прасачыць, як яны будаваліся, як аздабляліся, што за малюнкі на рашоткаx.

Канешне, тут варта разнастайных будынкаў, якія зацікавяць турыстаў, чаго толькі варта кірха, зробленая ў стылі канструктывізму. Падобных помнікаў архітэктуры ў Беларусі няма, бо такі стыль не выкарыстоўваўся для культавых пабудоў.

ПАДАРОЖЖА Ў ЧАСЕ

У савецкіх выданнях, прысвечаных архітэктуры Беларусі, хутчэй за ўсё вы маглі сустрэць план горада Віцебска, складзены на загад князя Шарамецьева ў 1664 годзе. Сёння дзякуючы гісторыкам і створаным імі маляўнічым картам-рэканструкцыям, можна прасачыць за гісторыяй горада. Трыпцях, прысвечаны віцебскім замкам XII, XIV і XVII стагоддзяў, можна пабачыць у будынку Духаўскага кругліка.

«Віцебск займае другое (пасля Гародні) месца па велічыні гістарычнага цэнтра, — адзначыў падчас віртуальнага падарожжа **віцебскі гісторык і экскурсавод Сяргей САМАНЕНКА.** — Размяшчэнне віцебскіх замкаў было абрана вельмі ўдала: на ўзвышшы, крыху рэльеф, і вакол іх была вада: рэкі Заходняя Дзвіна і Віцьба, ручаі Замкавы і Дунай».

Пра XII стагоддзе нагадвае Дабравешчанская царква. Ёй удалося перажыць многае, нават пасля Вялікай Айчыннай вайны яна выстаяла, але была ўзарвана ў 1961 годзе, засталіся толькі кавалкі сцяны вышынёй у пяць метраў, ужо ў наш час яе аднавілі.

Калі ў XII стагоддзі Віцебск быў забудаваны драўлянымі пабудовамі, то ў XIV стагоддзі ён «апранаўся» ў камень. У той час горад ужо знаходзіўся ў складзе Вялікага Княства Літоўскага і важна было ўзмацніць яго ўмацаванні.

У XVI стагоддзі горад падвяргаўся шматлікім нападам, замкі часткова разбураліся, іх муры не паспявалі адначаўляць, і таму тут зноў сталі з'яўляцца драўляныя пабудовы. Па перыметры ўзводзіліся новыя вежы, у кожнай з якіх была ўласная назва.

На тэрыторыі горада знаходзіліся ажно тры замкі — Верхні, Ніжні і Узгорскі. Дзякуючы працы даследчыкаў можна даведацца, дзе раней якія пабудовы стаялі і што сёння знаходзіцца на тым месцы. Таму, калі канаравірус адступіць, экскурсаводы тут будуць рады дапамагчы падарожнікам здзейсніць вандроўку ў часе і прасторы. А ў будучым магчыма дзякуючы сучасным тэхналогіям можна будзе паглыбляцца ў гісторыю і хадзіць па страрадаўніх горадзе, надзеўшы акуляры віртуальнай рэальнасці.

А можа, вас зацікавіць шпацыр па губернскім горадзе разам з **віцебскім экскурсаводам Людмілай БАЛЬШАКОВАЙ,** падчас якога вы даведаецеся, чаму ў горадзе так любіў бываць мастак Юзаф Пешка, як выглядалі храмы ў XVIII—XIX стагоддзях, як у горадзе змагаліся з п'янствам, якая губернатарша гарцавала па горадзе на кані і запрашала-збірала людзей на разнастайныя культурніцкія мерапрыемствы, што прыдумаў трамвай на электрычнай цязе і як пасля рэвалюцыі адбываліся агітацыйныя сустрэчы і спектаклі?

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Вяртанне

Адраджэнне Святыні

У апошні дзень вясны ў вядомым далёка за межамі Беларусі Свята-Успенскім Пустынскім мужчынскім манастыры, што за 10 кіламетраў ад Мсціслава, адбыўся чын Вялікага асвячэння адноўленага храма Пакрова Божай Маці. Яго правёў архіепіскап Магілёўскі і Мсціслаўскі Сафроній. Храм 1865 года пабудовы знаходзіўся на рэстаўрацыі 10 гадоў і быў вернуты да жыцця з дапамогай сродкаў дзяржпраграмы «Культура Беларусі». На гэтыя мэты з бюджэту было накіравана больш чым пяць мільёнаў рублёў.

— Гэта вельмі каштоўны культурна-гістарычны аб'ект, і яго адраджэннем займаліся і самі насельнікі, і дзяржава, і спонсары, і прыхаджане, — адзначыў **старшыня Мсціслаўскага райвыканкама Дзмітрый ПІМАШЭНКА.** — Пэўную суму на рэканструкцыю храма перадалі малочная кампанія «Бабуліна крынка» і Горацкі лясгас. Акрамя гэтага, былі праведзены бягучыя рамонты манастырскіх пабудоў і купелі. Сёлета ў планах завяршыць будаўнічыя лесвіцы, якая вядзе да Святой крыніцы, і званіцы, якая з'яўляецца візітоўкай манастыра.

Свята-Успенскі Пустынскі манастыр быў пабудаваны некалькі стагоддзяў таму на намоленым месцы. Заснаваў яго адзін з родапачальнікаў князяў мсціслаўскіх Лугвен — сын вялікага князя літоўскага Альгерда. Паводле легенды, пасля цяжкай хваробы князь пачаў траціць зрок. Аднойчы яму прысніўся сон, у якім паважаны старац сказаў: «Ідзі ў Пустынь (манаскае паселішча), умыйся з крыніцы і вылечышся». Князь зрабіў усё, што патрабавалася, і ачуняў. І першае, што ён убачыў, у галінках ліпы каля гэтай крыніцы — ікі Прасвятой Багародзіцы. Удзячны князь адразу ж вырашыў пабудаваць тут праваслаўны манастыр.

У савецкі час манастырскія будынкі спрабавалі знесці, але да канца вар'яцкая спроба даведзена не была. А ў 2003 годзе сюды зноў вярнулісь манахі і з блаславення тады яшчэ епіскапа, а зараз архіепіскапа Магілёўскага і Мсціслаўскага Сафронія пачаліся новае жыццё святыні. Тое, што гэта павінна было адбыцца, сведчыць цуд, які адбыўся ў самым пачатку адраджэння жыцця ў манастыры. Падчас рамонту аднаго з будынкаў на сцяне з'явілася вывяза аблічча Хрыста, падобная да той, што знаходзіцца на Турынскай плашчаніцы.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н.С., извещает о проведении 6 июля 2020 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
	Местонахождение лотов №№ 1–65: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8		
1	Благоустройство территории Жлобинского ПМЗ (перед входом), тротуарная плитка (131,0 кв. м), железобетонное ограждение (52,0 м п.), цветочница (фонтан) к зданию столовой на 84 посадочных места (инв. № 320/С-13341)	**2 361,22**	236,12
2	Цифровая инженерная система ОСЕ, инв. № 61398	**18 500,00**	1 850,00
3	Станок полуавтомат 2Е-440А, инв. № 50295	**2 700,00**	270,00
4	Станок токарный 16К25, инв. № 60338	**9 700,00**	970,00
5	Станок токарно-винторезный ГС-526У-01, инв. № 60479	**20 700,00**	2 070,00
6	Станок токарно-винторезный ГС-526У-02, инв. № 60791	**67 900,00**	6 790,00
7	Лазерный принтер HP LaserJet Pro 400MFP, инв. № 61321	**110,00**	11,00
8	Емкости металлические для ГСМ шт. 6 (25 куб. м – 1 шт., 11 куб. м – 1 шт., 3 куб. м – 4 шт.), инв. № 60444	**1 800,00**	180,00
9	Вертикальный консольно-фрезерный станок со столом FSS450R, инв. № 60459	**45 400,00**	4 540,00
10	Аппарат копировальный многофункциональный KYOGERA KM-3650W (эра), инв. № 60882	**2 100,00**	210,00
11	Вальцы ИБ 2222, инв. № 133	**5 700,00**	570,00
12	Станок токарно-карусельный 1541, инв. № 134	**25 700,00**	2 570,00
13	Телевизор «Горизонт» 32 LCD, инв. № 60879	**160,00**	16,00
14	Вальцы для гибки двутавра, инв. № 50602	**14 100,00**	1 410,00
15	Вальцы И-2926, инв. № 40	**8 700,00**	870,00
16	Рольганг для станка правки грибовидности, инв. № 61414	**2 300,00**	230,00
17	Рольганг для станка правки грибовидности, инв. № 61413	**2 300,00**	230,00
18	Трактор сварочный MZ1000, инв. № 60411, 60412	**7 600,00**	760,00
19	Станок радиально-сверлильный ОС 2833, инв. № 50352	**8 900,00**	890,00
20	Комплект сварочного полуавтомата «Варио Синержик» 5000-2 ZA-Евро, инв. № 60808	**1 600,00**	160,00
21	Полуавтомат сварочный Origo Mig 502c, инв. № 61214	**8 000,00**	800,00
22	Сварочный трактор RILON, инв. № 61395	**5 900,00**	590,00
23	Установка аргон-дуг. УДГУ-351 АС/ДС, инв. № 60499	**1 700,00**	170,00
24	Аппарат воздушно-плазменной резки CUT100, инв. № 61186	**1 200,00**	120,00
25	Станок радиально-сверлильный 2К550, инв. № 60960	**6 900,00**	690,00
26	Станок радиально-сверлильный ГС545, инв. № 60661	**22 900,00**	2 290,00
27	Станок радиально-сверлильный ГС545, инв. № 61145	**26 700,00**	2 670,00
28	Плита монтажная 1.5*3000, инв. № 60944	**16 300,00**	1 630,00
29	Плита монтажная 1.5*3000, инв. № 60945	**16 300,00**	1 630,00
30	Плита монтажная 1.5*3000, инв. № 60946	**16 300,00**	1 630,00
31	Плита монтажная 1.5*3000, инв. № 60947	**16 300,00**	1 630,00
32	Плита монтажная 1.5*3000, инв. № 60948	**16 300,00**	1 630,00
33	Установка правки двутавровых балок JZJ-800, инв. № 61408	**26 400,00**	2 640,00
34	Установка для сборки балок HZJ -1800, инв. № 61312	**114 000,00**	11 400,00
35	Механизм подачи PDE-41W, инв. № 60787	**1 600,00**	160,00
36	Сварочный аппарат HUGONG THMIG-500 в к-те, инв. № 60820	**1 600,00**	160,00
37	Кондиционер G12LHP, инв. № 60969	**500,00**	50,00
38	Кондиционер G12LHP, инв. № 60970	**500,00**	50,00
39	Кондиционер G12LHP, инв. № 60971	**500,00**	50,00
40	Кондиционер LG S18LHP, инв. № 60975	**700,00**	70,00
41	Кондиционер LG S18LHP, инв. № 60916	**700,00**	70,00
42	Кондиционер LG S18LHP, инв. № 60923	**700,00**	70,00
43	Кондиционер LG S18LHP, инв. № 60917	**700,00**	70,00
44	Кондиционер LG S18LHP, инв. № 60924	**700,00**	70,00
45	Кондиционер LG S18LHP, инв. № 60918	**700,00**	70,00
46	Кондиционер LG S18LHP, инв. № 60919	**700,00**	70,00
47	Кондиционер LG S18LH, инв. № 60974	**700,00**	70,00
48	Кондиционер LG S24H, инв. № 60655	**800,00**	80,00
49	Кондиционер Panasonic 18 DKD, инв. № 60653	**600,00**	60,00
50	Кондиционер Panasonic 18 DKD, инв. № 60654	**600,00**	60,00
51	Автомобиль AUDI A6, рег. № 5371 AP-3, тип ТС – легковой седан, тип двигателя – дизельный, объем 2,7 л, 6-ст. МКПП, колесная формула 4х2, 2006 года выпуска, условно-пригоднное техническое состояние	**17 000,00**	1 700,00
52	Водогрейный котел на МТВ, инв. № 61103	**27 000,00**	2 700,00
53	Водогрейный котел на МТВ, инв. № 61104	**27 000,00**	2 700,00
54	Сварочный аппарат Herman Shark 505M, инв. № 61332	**20 000,00**	2 000,00
55	Сварочный аппарат Herman Shark 505M, инв. № 61224	**19 000,00**	1 900,00
56	Пригрузы большие, инв. № 61050	**600,00**	60,00
57	Пригрузы большие, инв. № 61051	**600,00**	60,00
58	Пригрузы большие, инв. № 61052	**600,00**	60,00
59	Пригрузы большие, инв. № 61053	**600,00**	60,00
60	Пригрузы большие, инв. № 61054	**600,00**	60,00
61	Электропечь SNOL 30/1300, инв. № 61357	**4 000,00**	400,00
62	Компрессор воздушный винтовой LS5-09F, инв. № 60593	**28 000,00**	2 800,00
63	Компрессор воздушный винтовой LS5-09F, инв. № 60594	**28 000,00**	2 800,00
64	Автоматизированная печь для литья, инв. № 40135	**7 300,00**	730,00
65	Автоматизированная печь для литья, инв. № 40136	**7 300,00**	730,00

